

**Пустую зямлю аднімуць праз год?**

МС



**Пакаштуйце страуса. Або смаўжа**

СТАР. 3



**Валянціна Гаявая — пра сябе і пра «Харошкі»**

СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ВЕРАСНЯ 2014 г. СЕРАДА № 176 (27786) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПА ДАРОЖНЫМ РАХУНКУ

## Аляксандр Лукашэнка прапануе Сусветнаму банку пашырыць фінансаванне праектаў дарожнага будаўніцтва ў нашай краіне

**Пра гэта ішла размова на сустрэчы кіраўніка дзяржавы з віцэ-прэзідэнтам Сусветнага банка па рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі Лорай Так, паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Вельмі вас прашу, каб у плане пашырэння фінансавання, якое прадугледжваецца на гэты і будучы гады, былі выдзелены Сусветным банкам дадатковыя рэсурсы для будаўніцтва аўтамабільных дарог у Беларусі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія спецыялісты прадставяць Сусветнаму банку планы і праекты, у тым ліку па дарожным будаўніцтве. «Думаю, вы падтрымаеце іх. Тым больш гэта не столькі інтарэс Беларусі, колькі Еўрапейскага саюза, Расіі і Азіі», — сказаў Прэзідэнт. «Калі такая падтрымка будзе, гарантую, што праз тры-чатыры гады дарожная сетка, асабліва па мадэрнізацыі транспартных калідораў, пашырыцца ў два разы і палепшыцца», — запэўніў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў той факт, што з боку Сусветнага банка аказваецца вялікая падтрымка Беларусі ў будаўніцтве аўтамабільных дарог. У краіне прыняты пэўныя праграмы на гэты і будучы год са значным аб'ёмам фінансавання. «Але Сусветны банк паабяцаў, што гэта фінансаванне можа быць яшчэ шырэйшым. У сувязі з тым, што іншыя суседнія транзітныя дзяржавы паміж Еўропай і Усходам цяпер у складаным становішчы, асабліва Украіна, Беларусь з'яўляецца найбольш прывабнай краінай транзіту», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што ў Беларусі прыняты дадатковыя захады па будаўніцтве і мадэрнізацыі існуючых транспартных калідораў паміж Еўропай і Азіяй.

Прэзідэнт падзякаваў Сусветнаму банку за супрацоўніцтва, а таксама за ацэнку, дадзеную ў яго штогадовай справаздачы, адзначыўшы, што «Сусветны банк з'яўляецца найменш палітызаванай фінансава-эканамічнай структурай». «Пра гэта сведчаць тыя праекты і праграмы, па якіх мы з вамі супрацоўнічаем», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што Сусветны банк аказаў вялікую дапамогу Беларусі ў мадэрнізацыі энергетычнай базы, што дало магчымасць значна рушыць наперад у энергаэфектыўнасці, а таксама ў пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што «Беларусь адкажа на гэта дабром».

# На парадку дня

## Пытанні падрыхтоўкі і правядзення саюзнага Саўміна абмеркавалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ёсць нямала пытанняў, якія патрабуюць вырашэння (у тым ліку ў сувязі з сітуацыяй на рынках, уведзеных Расіяй эмбарга, у эканамічных адносінах з ЕС, а таксама ў ваенна-палітычнай сферы), абмеркавання на самым высокім узроўні. «Таму нам трэба вызначыцца, каб парадак дня быў кампактным. З нашага боку пытанняў няма, думаю, не будзе і з боку кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Па словах Рыгора Рапоты, парадак дня пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы сфарміравана, рыхтуецца для Вышэйшага Дзяржсавета. «Спадзяёмся, што ў гэтым годзе ўсё ж такі правядзём, трэба будзе зацвердзіць бюджэт, і сапраўды назапасіўся шэраг пытанняў, якія патрабуюць прынцыповага рашэння», — сказаў ён, дадаўшы, што ў іх ліку пытанні ўзгодненай прамысловай палітыкі, уласнасці Саюзнай дзяржавы. Рыгор Рапота таксама адзначыў, што па даручэнні Вышэйшага Дзяржсавета рыхтуюцца Прыярытэтныя напрамкі развіцця Саюзнай дзяржавы.

# АД ВЫТОКАЎ ДА ПЕРАМОГІ



Фота Надзеі БУЖАН.

**Выхаванцы Заслаўскай гарадской дзіцячай спартыўнай школы на трэніроўцы.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід КАВАЛЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:**

***«Як вядома, з 1 студзеня 2014 года ў краіне ўведзена дзяржпошліна на допуск аўтамабіляў да ўдзелу ў дарожным руху, яе плацельшчыкамі прызнаны ўсе ўласнікі транспартных сродкаў — фізічныя і юрыдычныя асобы. Але пры гэтым аказаліся ўшчэмленымі правы тых катэгорый грамадзян, якія маюць права на льготы. Сярод іх — пенсіянеры, інваліды, маламаёмасныя, якіх прыраўнавалі да астатніх пры праходжанні тэхагляду іх транспартнага сродку. Практыка прымянення гэтай нормы паказала, што на гэтую катэгорыю грамадзян неабходна звярнуць увагу і пайсці ім на саступкі. У сувязі з гэтым пры падрыхтоўцы праекта закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2015 год» вывучаецца пытанне аб магчымасці зніжэння для пенсіянераў, інвалідаў I і II групы памеру дзяржпошліны на 50%».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.09.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10510,00 | ▲ |
| Еўра | 13590,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 272,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 764,36 | ▼ |

■ Спорт — справа маладых

**Ганна ТАРАСЮК:**

# «ПАКУЛЬ РАВЕСНІКІ ХАДЗІЛІ НА ДЫСКАТЭКІ...»

## Алімпійская чэмпіёнка юнацкіх Гульняў распавядае, чаму ў свой час выбрала кап'ё, а не віяланчэль



Фота Надзеі БУЖАН.

**На юнацкай Алімпіядзе ў Нанкіне беларускія спартсмены сёлета завявалі 9 медалёў. На тры больш, чым на дэбютных Гульнях у Сінгапуры чатыры гады таму. Пры гэтым пяць узнагарод — залатыя. Адным з трыумфатараў спаборніцтваў стала шаснаццацігадовая лёгкаатлетка Ганна ТАРАСЮК — дачка чэмпіёнкі свету 1995 года і сярэбранай прызёркі Алімпіяды-1992 у кіданні кап'я Наталлі Шыкаленкі. Мы сустрэліся з маладой спартсменкай, каб даведацца, чаму цяжка трэніравацца пад кіраўніцтвам маці, каго бяруць у віяланчалісткі і як вярнуць даўжок дваццацідвухгадовай даўнасці.**

### 60-МЕТРОВАЕ ШЧАСЦЕ

Да нанкінскай Алімпіяды Аня ўдзельнічала амаль што ва ўсіх маладзёжных спаборніцтвах — Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі, Гімназіядзе, Еўраазіяцкіх гульнях, — але розніцу дзяўчына адчула адразу.

— Вядома, трэнеры настройвалі нас, быццам гэта звычайныя спаборніцтвы, каб мы не адчувалі дадатковага ціску. Але не зразумець, дзе ты знаходзішся, было немагчыма. Арганізацыя — проста шыкоўная. Калі мы толькі прыляцелі ў Кітай, у Шанхаі нас сустрэлі два аўтобусы, хаця мы думалі, што да Нанкіна прыйдзецца дабірацца сваім ходам. А колькі там было валанцёраў! З намі няньчыліся, як з малымі дзецьмі. Увогуле, усё было сур'ёзна, як на дарослай Алімпіядзе. Высокапастаўленыя госці, цырымоніі адкрыцця і закрыцця... Я, дарэчы, была капітанам беларускай зборнай і несла сцяг на адкрыцці. Гэта такі гонар!.. Не апісаць словамі.

СТАР. 6

■ Жыллё

# «КВАДРАТ» СТАБІЛЬНАСЦІ

## Пакупнікі нерухомасці менш зважаюць на планіроўку і камфорт. Галоўнае — кошт

**Рэальны ўстойлівы попыт на недарагое жыллё ў Мінску пачынае прымушаць арганізатараў камерцыйнага будаўніцтва ўзводзіць дамы з большай колькасцю кватэр невялікіх плошчаў. Пра гэта сведчыць агляд жыллёвага рынку за мінулы жнівень аддзелам кансалтынгу і аналітыкі групы кампаній «Твая сталіца».**

### НОВАБУДОЎЛІ ТОЛЬКІ ДАРАЖЭЮЦЬ

Сёння аналітыкі гэтай кампаніі адзначаюць, што сярэдні кошт квадратнага метра на першасным рынку жылля ў Мінску па выніках жніўня склаў 1670 долараў. У параўнанні з ліпенем сярэдняя цана засталася практычна без змен. Калі разглядаць дынаміку з першых дзён года, то назіраецца невялікі, але ўсё ж дадатны рух сярэдняй цаны «квадрата» на 2%, або на 35 долараў.

Цяпер сярэднія цэны прапановы новабудоўляў камерцыйнымі забудоўшчыкамі ў разрэзе класаў якасці выглядаюць наступным чынам. У дамах класа «эканом» квадратны метр прапануецца за 1395 долараў, па класе «стандарт» цэннік метра складае 1580 долараў, па класе «камфорт» — 1860 долараў, «прэстыж» — 2 490 долараў.

СТАР. 2

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



## Еўрапарламент ратыфікаваў пагадненне аб асацыяцыі з Украінай

Еўрапейскі парламент ратыфікаваў пагадненне аб асацыяцыі Украіны з ЕС, паведамляюць інфармагенцтвы. Працэдура ратыфікацыі ўчора пачалася сінхронна: у Вярхоўнай Радзе — у 13.00 па кіеўскім часе, у Еўрапейскім парламенце — у 11.00 па еўрапейскім часе. Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка падпісаў закон аб ратыфікацыі пагаднення аб асацыяцыі ў зале Рады. Пагадненне аб асацыяцыі з ЕС уключае стварэнне зоны свабоднага гандлю.

## Рада прыняла закон аб статусе Данбаса

Вярхоўная Рада Украіны прыняла законы аб асаблівым статусе асобных раёнаў Данбаса і амністыі. Дакументы «Аб асаблівым парадку мясцовага самакіравання ў асобных раёнах Данецкай і Луганскай абласцей» і «Аб недапушчэнні пераследу і пакарання асоб — удзельнікаў падзей на тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей» перададзены дэпутатам прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам, учора былі разгледжаны і прыняты. Характэрна, што ў Радзе, па звестках СМІ, у гэты час прысутнічаў сам прэзідэнт. За асаблівы статус прагаласавалі 277 чалавек, за амністыю — 287 парламентарыяў. Згодна з Законам аб асаблівым парадку мясцовага самакіравання, у асобных раёнах Данецкай і Луганскай абласцей мясцовыя выбары адбудуцца 7 снежня 2014 года. На тры гады ўводзіцца асаблівы парадак мясцовага самакіравання ў межах раёна правядзення АТА. На той жа тэрыторыі ствараюцца атрады народнай міліцыі: каардынацыя іх дзейнасці ажыццяўляецца адпаведным сельскім, пасялковым, гарадскім галавой. Закон аб амністыі прадугледжвае вызваленне ад адказнасці «ўдзельнікаў узброеных фарміраванняў», членаў самаабвешчаных органаў у Данецкай і Луганскай абласцях, а таксама людзей, якія супрацьдзейнічалі правядзенню антытэрарыстычнай аперацыі.

## Здабыча сланцавага газу выклікае землятрусы

Амерыканскія навукоўцы выявілі прамую залежнасць павелічэння частаты землятрусаў ад тэхналогіі па здабычы сланцавага газу пры дапамозе гідраразрыву падземных пластоў пад высокім ціскам. У Геалагічнай службе ЗША падлічылі, што пасля таго, як энергетычныя кампаніі сталі па гэтай тэхналогіі здабываць газ у такіх сейсмічна спакойных раёнах, як штаты Каларада і Нью-Мексіка, там адбылося 16 даволі моцных землятрусаў з магнітудай больш за 3,8 бала, паведамляе BBC.



ISSN 1990 - 763X

14176>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## У Нідэрландах у ДТЗ трапілі 150 аўтамабіляў

На поўдні Нідэрландаў адбылося ДТЗ з удзелам 150 аўтамабіляў. Як паведамляе The News Tribune, прычынай аварыі стаў густы туман.





Ахвярамі ДТЗ сталі як мінімум два чалавекі, дакладная колькасць пацярпелых пакуль невядома. Многія вадзіцелі і пасажыры аказаліся заблакаванымі ў сваіх аўтамабілях на месцы здарэння. На месцы аварыі працавалі 50 машын хуткай дапамогі. У паліцыі назвалі тое, што адбылося, «жахлівым хаосам». Інцыдэнт адбыўся ў ранішні час пік на трасе A58, у 150 кіламетрах ад Амстэрдама.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «ГАЗЕТА БЫЛА І ЗАСТАЕЦЦА НАШАЙ НАСТАЎНІЦАЙ»



**Раіса Сцяпанаўна ВАСІЛЬЕВА, пенсіянерка, г. Гомель:**

**Калі гэта пачалося, — зараз не ўспомню. Такое ўражанне, што «Звязду» я чытала заўсёды. Яна была маёй спадарожніцай, маёй настаўніцай. Так, настаўніцай, бо беларускую мову я вучыла напрыканцы 40-х, а потым дапамагалі кнігі, радыё і мая «Звязда».**

Дзякуючы ёй я заўсёды ведала, што адбываецца ў краіне і свеце, набывала такі патрэбны ўсім жыццёвы досвед: як лячыць, як вучыць (па прафесіі я настаўніца матэматыкі), як пасадзіць і пасеяць, што прыгатаваць...

Я заўсёды захаплялася музыкай і жывапісам, лічыла і лічу, што нельга не ведаць гісторыю сваёй краіны. Таму заўсёды чакала (і чакаю) субот са звяздоўскай «Жырандоляй» і аўторкаў з «Ігуменскім трактам». У вольны час я сама рабіла (і раблю) карціны з саломкі (адбыліся ўжо тры выставы), таму заўсёды ўзіралася ў шыкоўныя здымкі Анатоля Клешчука. Мне вельмі хацелася болей даведацца пра жыццё людзей, якія дасягнулі нейкіх жыццёвых поспехаў, бліжэй пазнаёміцца з «зоркамі». Таму я ўдзячна «Звяздзе» за цікавыя сустрэчы і гутаркі.

Па радыё выпадкова пачула новую песню «Белая, белая яблыня». Спадабалася — цэлы дзень напявала яе на лецішчы. А вечарам разгарнула свежы нумар «Звязды» — а там... словы! Хіба ж гэта не цуд? Я ўжо не кажу пра «Алё, народ на провадзе!» і конкурс «Хто каго?». Тут сустрэнеш часам такое — колькі чытаеш, столькі смяешся!

А «Фотаслова» Яўгена Пясецкага! А...

Карацей, расказваць пра вартасці «Звязды» я магу бясконца. За той час, што яна ў нашай хаце, па-беларуску навучыўся чытаць мой муж (ён родам з Чарнігаўшчыны) і мае ўнукі-расіяне. Вельмі многае яны разумеюць самі, астатняе пытаюцца ў мяне, але галоўнае, што ім хочацца чытаць тое, што напісана... Ім таксама цікава!

Таму падчас падпіскі ў мяне сумненняў няма: «...Як кахаць, дык каралеву! Як выпісваць, то «Звязду»!

**Запісала Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** ***Вы таксама выбралі для сябе «родную газету на роднай мове»? І хацелі б расказаць, чаму? Тады пішыце, дасылайце свой фотаздымак. Самыя цікавыя лісты будуць надрукаваны.***

*Ідзе падпіска на газету «Звязда» на IV квартал.*
*Заставайцеся з намі — мы пішам пра тое, што сапраўды важна!*

■ Партнёры

# НАМ МІЛЬЯРДА МАЛА

**Беларуска-Казахстанскі бізнес-форум стартаваў учора ў Мінску. Беларусь прымае гандлёвую місію з 12 казахстанскіх прадпрыемстваў. Весці перамовы аб супрацоўніцтве будуць казахстанскія кампаніі, якія займаюцца вытворчасцю будаўнічых матэрыялаў, прадуктаў харчавання, машынабудаўнічага абсталявання, хімічнай і фармацэўтычнай прадукцыі.**

Бізнес-форум праходзіць ужо трэці год запар. Новыя гандлёвыя ўзаемавыгадныя магчымасці з'явіліся дзякуючы пагадненням унутры Мытнага саюза. Як адзначае **Вячаслаў РАВУТА, першы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты,** узаемны экспарт таварамі развіты дастаткова добра, чаго нельга пакуль што сказаць пра экспарт паслуг. Беларусь і Казахстан яшчэ не да канца засвоілі свае патэнцыйныя магчымасці ў гэтым кірунку. У прыватнасці, гэта тычыцца будаўніцтва і аховы здароўя. Таксама магутным рычагом супрацоўніцтва з'яўляецца сумесная праца па пагадненнях Адзінай эканамічнай прасторы.

«Мы прыехалі з мэтай умацаваць ужо наладжаныя сувязі і знайсці новых партнёраў для пашырэння дзелавога супрацоўніцтва. Сёння тавараразварот паміж нашымі краінамі складае каля 1 мільярда долараў. Але, як было адзначана кіраўнікамі дзяржаў, тавараразварот неабходна павялічыць у 2 разы. Такія мерапрыемствы спрыяюць дасягненню пастаўленых мэтаў», — падкрэсліў **Меержан МАЙКЕНАЎ, намеснік старшыні праўлення АТ «KAZNEX INVEST».**

У Казахстане функцыянуе больш за 100 сумесных вытворчасцяў. Сумарны аб'ём інвестыцыйных праектаў складае больш за 100 мільёнаў долараў. У Казахстане працуюць каля 20 сэрвісных цэнтраў такіх беларускіх кампаній, як МАЗ, БелАЗ, МТЗ, «Атлант».

«Для Казахстана вопыт Беларусі ў развіцці машынабудавання і сельскай гаспадаркі мае вялікае значэнне. З аднаго боку, мы вучымся ў беларусаў, з другога — рэалізуем сумесныя праекты ў Казахстане. Мы прыехалі з вялікай наменклатурай — для абмеркавання магчымасцяў павелічэння паставак казахстанскай прадукцыі ў Беларусь. Плануем давесці экспарт да 300 мільёнаў долараў», — адзначыў Меержан Майкенаў.

Па аб'ёме экспарту для Беларусі Казахстан з'яўляецца трэцім значным партнёрам у СНД — пасля Расіі і Украіны. Сальда знешняга гандлю паміж дзвюма краінамі летась склала 785,9 мільёна долараў. За студзень — сакавік гэтага года сальда ўжо склала 162,3 мільёна долараў. Аб'ём знешняга гандлю паслугамі ў студзені — лютым 2014-га павялічыўся на 29% у параўнанні з 2013 годам і склаў 12,2 мільёна долараў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Знешняя палітыка

# НАШ ДЫПЛАМАТ — АДЗІН З КІРАЎНІКОЎ ОРГАНА ААН

**Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры аддзяленні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і іншых міжнародных арганізацыях у Жэневе Міхаіл Хвастоў абраны віцэ-старшынёй Савета па гандлі і развіцці ЮНКТАД. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства замежных спраў Беларусі.**

ЮНКТАД (Канферэнцыя ААН па гандлі і развіцці) — орган Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Галоўная мэта ЮНКТАД — садзейнічанне інтэграванню краін, якія развіваюцца, і краін з пераходнай эканомікай у сусветную эканоміку. Савет па гандлі і развіцці — выканаўчы орган ЮНКТАД.

61-я сесія Савета па гандлі і развіцці пачала працу з гэтага панядзелка і будзе доўжыцца да 26 верасня. Старшынёй Савета стала пастаянная прадстаўніца Іспаніі пры Аддзяленні ААН і іншых міжнародных арганізацыях у Жэневе Ганна Марыя Менендэс Пэрэс.

Па інфармацыі МЗС, Савет разгледзіць пытанні процідзеяння эканамічнай няроўнасці, устойлівага аднаўлення глабальнай эканомікі, тэндэнцый міжнароднай гандлёвай сістэмы, інвестыцыйнага супрацоўніцтва, а таксама шэраг пытанняў па праблематыцы найменш развітых краін. Плануецца прыняць шэраг рашэнняў, якія тычацца арганізацыі далейшай працы ЮНКТАД.

У сваіх выступленнях прадстаўнікі Беларусі адзначылі ролю сельскай гаспадаркі для краін з пераходнай эканомікай. Дэлегацыя нашай дзяржавы звярнула ўвагу міжнароднай супольнасці на неабходнасць больш глыбокага вывучэння плана дзеянняў па мабілізацыі інвестыцый у мэтах устойлівага развіцця, прапанаванага ЮНКТАД.

Як паведамляе прэс-служба знешнепалітычнага ведамства, прадстаўнікі Беларусі, улічваючы шэраг рэалізаваных у рэгіёне праектаў тэхнічнай дапамогі, станоўча ацанілі працу ЮНКТАД у галіне тэхнічнага супрацоўніцтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

# «КВАДРАТ» СТАБІЛЬНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па новай класіфікацыі першаснага жылля, **самым шматлікім на рынку і запатрабаваным пакупнікамі з'яўляецца клас «Стандарт»,** таму яго можна разглядаць як свайго роду індыкатар. У параўнанні з ліпенем ваганне сярэдняй цаны квадратнага метра новабудоўляў гэтага класа склала +1%, ці 20 долараў — да ўзроўню 1580 долараў за «квадрат». У прыватнасці, сярэдні кошт метра аднапакаёвых кватэр па выніках жніўня склаў 1650 долараў, двухпакаёвых — 1560 долараў і 1630 долараў у трохпакаёвых.

Пакупніцкая актыўнасць на першасным рынку жылля застаецца стабільнай. Але калі летась пры наяўнасці параўнальна даступных крэдытных рэсурсаў, для пакупнікоў нароўні з коштам на першым месцы стаялі такія крытэрыі выбару, як якасць (прасторныя планіроўкі, шклопакеты, імпартныя ліфты і г. д.) і месцазнаходжанне новабудоўлі, то цяпер, з вялікім адрывам ад іншых крытэрыяў, асноўным з'яўляецца кошт. Разумеючы гэта, у апошні час забудоўшчыкі ўсё часцей карэктуюць свае праекты па жылой нерухомасці з мэтай змяншэння агульнай плошчы кватэр. Гэта робіцца з мэтай зніжэння канчатковага кошту здзелкі пры захаванні бягучага ўзроўню цэн у разліку за квадратны метр, бо крэдытныя рэсурсы цяпер для пакупнікоў застаюцца нявыгаднымі, а рэальныя даходы — невысокімі.

## ПРАДАЦЬ СТАРОЕ, КАБ КУПІЦЬ НОВАЕ

На другасным рынку жылля ўжо на працягу прыкладна шасці месяцаў сярэдні кошт квадратнага метра кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў захоўваецца на ўзроўні 1540–1550 долараў. Такі ўзровень цэннікаў на рынку тлумачыцца тым, што цяпер цэны апусціліся да прымальнага для пакупнікоў ўзроўню, і нават павелічэнне аб'ёмаў прапановы не ў стане іх скарэктаваць у бок далейшага зніжэння. Для захавання існуючай сітуацыі важна, каб прадаўцы і пакупнікі «пачулі» адзін аднаго. Акрамя таго, як паказвае практыка, неабгрунтавана высокі кошт кватэры значна павялічвае тэрмін яе продажу і памяншае колькасць зваротаў патэнцыйных пакупнікоў як мінімум удвая. А вось прамаруджванне і першапачаткова завышаныя патрабаванні з боку пакупнікоў да знойдзенай ліквіднай кватэры ў большасці сваёй прыводзяць да таго, што такое жыллё знаходзіць сабе іншага ўласніка.

У плане пакупніцкай актыўнасці жнівень толькі крыху саступіў ліпеню, які стаў адным з самых удалых сёлета. Летась пік пакупніцкай актыўнасці прыпаў менавіта на апошнія месяцы лета, але тады ў распараджэнні пакупнікоў былі даступныя крэдытныя рэсурсы. Сённяшні ўсплёск можна растлумачыць жаданнем пакупнікоў як мага хутчэй і больш выгадна вырашыць сваё жыллёвае пытанне перад надыходам новага навучальнага сезона і пачаткам восені.

Кошт «квадрата» бюджэтных кватэр за гэты час амаль не знізіўся. Па выніках жніўня, сярэдні цэннік квадратнага метра аднапакаёвых кватэр сфарміраваўся на ўзроўні 1620 долараў, двухпакаёвых — 1510 долараў, трохпакаёвых — 1400 долараў.

Цана метра ў кватэрах з рамонтам і мэбляй знаходзіцца на ўзроўні пачатку года: аднапакаёвыя кватэры — 1870 долараў, двухпакаёвыя — 1800 долараў і 1670 долараў за трохпакаёвыя. Стабільнасць коштаў на другасным рынку жылля і шырокі выбар кватэр спрыяюць так званым «ланцуговым» здзелкам, калі перад купляй новай кватэры неабходна прадаць старую. Пры гэтым тэрміны «старая» і «новая» можна разумець літаральна, бо тэндэнцыя апошняга часу такая, што ўсё больш пакупнікоў узамен сваёй кватэры другаснага жылога фонду хочуць купіць кватэру ў новабудоўлі.

У сегменце элітных кватэр казаць пра нейкую сярэднюю цану квадратнага метра не выпадае — дыяпазон коштаў на такія кватэры вельмі шырокі, бо кожная з іх па-свойму ўнікальная. Але ў любым выпадку пакупнікам варта арыентавацца на кошт квадрата, які пачынаецца з 2 тысяч долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Навіны ■ Падзеі ■ Факты

### ЗАФІКСУЙ ІМГНЕННЕ!

**Міністэрства інфармацыі Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва» і Беларускі саюз журналістаў абвясцілі пра пачатак новага рэспубліканскага фотаконкурсу «Фота Беларусі».**

Удзельнічаць у творчым конкурсе могуць як прафесійныя фатографы, так і аматары. Галоўнае — паказаць гісторыю і сучаснасць нашай краіны так, каб гэта засведчыла маральныя і эстэтычныя ідэалы, зацвердзіла вечныя каштоўнасці і прадэманстравала дасягненні ў самых розных галінах.

Прыём заявак пачнецца 30 верасня. Вынікі плануецца падвесці ў маі наступнага года. Узнагароджванне пераможцаў адбудзецца на спецыяльнай цырымоніі. Плануецца таксама арганізаваць фотавыставу і выпусціць альбом з работамі лаўрэатаў і пераможцаў.

Падрабязнасці — на нашым сайце www.zviazda.by.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ЗНОЎ НА МЕСЦЫ

**Стаўка рэфінансавання ў верасні захаваецца на ўзроўні 20% гадавых. Такое рашэнне прынята 15 верасня на пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка.**

«На фоне станоўчых тэндэнцый, якія назіраюцца на валютным і дэпазітным рынках краіны, інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў у рэспубліцы па-ранейшаму застаецца досыць высокай, — тлумачаць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. — Так, у жніўні прырост спажывецкіх цэн склаў 0,8%, за 8 месяцаў 2014 года — 12%. Акрамя таго, захоўваюцца інфляцыйныя рызыкі, звязаныя з развіццём знешнепалітычнай і эканамічнай сітуацыі ў шэрагу краін рэгіёна».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### ДЗЯВЯТЫЯ, БЫКАЎСКІЯ...

**У Гродне ў абласной навуковай бібліятэцы імя Яўхіма Карскага прайшлі дзявятыя Гродзенскія навуковыя чытанні. Прысвечаны яны былі жыццю і творчасці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.**

Каля 25 гадоў пражыў Васіль Уладзіміравіч у Гродне, таму, зразумела, удзельнікам чытанняў было пра што пагаварыць у дачыненні да славутага земляка. З паведамленнямі пра творчасць слыннага пісьменніка выступілі краязнаўцы, навукоўцы, пісьменнікі, літаратуразнаўцы. Сярод іх — дырэктар бібліятэкі Лідзія Мальцава, другі сакратар пасольства Беларусі ў Польшчы Юлія Рубіна, кандыдат філалагічных навук Аляксей Пяткевіч, пісьменніцы Ірына Шатыронак, Ала Петрушкевіч, Алена Руцкая, дасведчаны літаратуразнаўца Ігар Жук, былы ўласны карэспандэнт газеты «Звязда» Вітольд Іваноўскі, пісьменнікі з Польшчы Міра Лукша, Віктар Швед і шмат хто яшчэ. Цікавымі падаліся і выступленні супрацоўнікаў музеяў і бібліятэк, у тым ліку Жанны Маклакавай, Святланы Рапецкай. Кожная з драбнічак-памятак пра Васіля Быкава — гэта ўжо складнік айчыннай культуры, айчыннай гісторыі.

**Максім ЛАДЫМЕРАЎ.**

### ЗАЯЎКА НА ПАРАЛІМПІЯДУ

**Студэнтка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта заняла трэцяе месца на чэмпіянаце свету па паралімпійскім дзюдо, які завяршыўся ў ЗША.**

У складзе беларускай каманды выступалі тры студэнты, два з іх навучаюцца ў БДПУ імя Максіма Танка: Арына Качан (4 курс) і Уладзіслаў Равенка (1 курс). Старшым трэнерам паралімпійскай зборнай па дзюдо з'яўляецца намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце, выкладчык кафедры спартыўных дысцыплін БДПУ Аляксандр Катлоўскі. Арына Качан узнялася на трэцюю прыступку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### СТУДЭНТЫ АТРУЦІЛІСЯ СПАЙСАМ

**Позна ўвечары 15 верасня з інтэрната Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна ў бальніцу хуткай дапамогі даставілі ў непрытомным стане чатырох маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 21 года.**

Медыкі западозрылі, што студэнты ўжывалі спайс. У рэанімацыйным аддзяленні бальніцы хлопцам была аказана дапамога, зараз іх жыццю нічога не пагражае. Упраўленне СК па Брэсцкай вобласці праводзіць праверку па факце ўжывання курыцельных сумесяў.

**Яна СВЕТАВА.**

### БАБУЛЮ АДШУКАЛІ З ВЕРТАЛЁТА

**Пра знікненне 82-гадовай жыхаркі вёскі Росцевічы Зэльвенскага раёна паведаміла ў міліцыю яе сястра. Каля 16 гадзін яна пайшла прагуляцца па наваколлі і не вярнулася.**

Сітуацыя ўскладнялася тым, што гэты зварот паступіў толькі на наступны дзень пасля знікнення бабулі. Яшчэ больш трывожна за яе лёс стала пасля таго, як аказаліся беспаспяховымі першапачатковыя пошукавыя мерапрыемствы. І тады праваахоўнікі звярнуліся да камандавання 181-й верталётнай базы з просьбай аб выкарыстанні верталёта для аператыўнага абследавання тэрыторыі, дзе, як меркавалася, магла знаходзіцца жанчына. І неўзабаве бабулю адшукалі. Яна трапіла ў забалочаную мясцовасць непадалёк ад роднай вёскі і самастойна адтуль не выбралася б, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### КАЛЯ ШКОЛЫ НЯМА ЗНАКА? ЗВАНІ Ў ДАІ

**З прышкольных тэрыторый у Мінску за парушэнне правілаў спынення і стаянкі штодня эвакуіруецца каля 50 аўтамабіляў.**

Ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама адзначылі, што некаторыя кіроўцы, жадаючы падвесці дзіця як мага бліжэй да навучальнай установы, пакідаюць транспарт на тратуарах і зялёных зонах, тым самым закрываючы праход навучэнцам да школы. Дзеці ў гэтым выпадку вымушаны выходзіць на праезную частку.

З пачатку навучальнага года інспектары ДАІ дзяжурылі па раніцах каля ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, забяспечваючы бяспеку дарожнага руху. Такая практыка паказала сваю эфектыўнасць, таму ў ДАІ вырашылі прадоўжыць ранішнія дзяжурствы каля школ. На дарожную сітуацыю каля навучальных устаноў можа паўплываць любы з бацькоў, паведаміўшы аб праблеме, што ўзнікла, у дзяжурную часць ДАІ: аб адсутнасці «ляжачага паліцэйскага», разметкі, знака.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Новаўвядзенні

# КАМАНДЗІРОЎКІ БЕЗ ПАДАТКАЎ

**Асноўным новаўвядзеннем Указа № 361 «Аб асобных пытаннях падаткаабкладання, бухгалтарскага ўліку, пераацэнкі маёмасці і спагнання арэнднай платы» ад 21 ліпеня 2014 г. з'яўляецца адтэрміноўка на 90 дзён права на вылік увазнога ПДВ для імпарцёраў тавараў. Таксама дакументам устаноўлена вызваленне ад падаходнага падатку камандзіровачных расходаў па найме жылога памяшкання ў памеры фактычна зробленых і дакументальна пацверджаных расходаў.**

Пра апошнія змены ў падатковым заканадаўстве падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА расказвалі **начальнік аддзела ўскоснага падаткаабкладання галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана НОВІКАВА** і **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб МПЗ Святлана ШАЎЧЭНКА.**

## ПРАВА НА ВЫЛІК ДЛЯ ІМПАРЦЁРАЎ

Сёлета з 25 ліпеня ўступіла ў сілу норма пп. 1.5 Указа № 361, якая прадугледжвае адтэрміноўку на 90 дзён выліку падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ), выплачанага пры ўвозе тавараў на тэрыторыю краіны. Напрыклад, калі тавар увезены з Расіі і прыняты на ўлік у чэрвені, а ПДВ выплачаны 25 ліпеня, адтэрміноўка на вылік увазнога ПДВ не ўжываецца. Згодна з пунктам 26 артыкула 107 Падатковага кодэкса пры змене парадку прымянення падатковых вылікаў новы парадак дзейнічае ў дачыненні да тавараў, набытых у дзяржавах — членах Мытнага саюза, з моманту яго змянення. Дата набыцця вызначаецца па даце прыняцця на ўлік тавараў. Паколькі тавар, імпартаваны з Расіі, прыняты на ўлік у чэрвені, гэта значыць, да змянення парадку ажыццяўлення выліку ўвазнога ПДВ, то на выплачаны па ім увазны ПДВ адтэрміноўка на вылік не ўжываецца.

А вось калі тавар увезены з Расіі і прыняты на ўлік 25 ліпеня, а ПДВ выплачаны 20 жніўня, то адтэрміноўка на вылік па ПДВ прымяняецца, бо тавар прыняты на ўлік з моманту змены парадку ажыццяўлення выліку ўвазнога ПДВ. Дата ўвозу вызначаецца па даце выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай.

У сітуацыі, калі ПДВ пры ўвозе тавараў з-за межаў Мытнага саюза выплачаны 24 ліпеня, а датай выпуску тавараў у мытнай дэкларацыі з'яўляецца 25 ліпеня, адтэрміноўка на вылік па ПДВ прымяняецца. Паколькі тавар, імпартаваны з дзяржавы, якая не з'яўляецца членам Мытнага саюза, выпушчаны 25 ліпеня 2014-га, гэта значыць, з моманту змены парадку ажыццяўлення выліку ўвазнога ПДВ.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЯК ЗНЯЦЬ ЖЫЛЛЁ Ў КАМАНДЗІРОЎЦЫ

Згодна з пп. 1.1 Указа № 361 вызваляюцца ад падаходнага падатку фактычна зробленыя і дакументальна пацверджаныя расходы па найме жылога памяшкання пры аплаце наймальнікам работніку расходаў па камандзіроўках як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі. Гэтая норма ўступіла ў сілу сёлета з 25 ліпеня і распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі з першых дзён года. Тут усё зразумела. А ці падлягае вяртанню падаходны падатак, вылічаны і ўтрыманы падатковымі агентамі да ўступлення ў сілу ўказа з сум перавышэння расходаў па найме жылога памяшкання над памерамі, вызначанымі заканадаўствам?

Святлана Шаўчэнка паведамляе, што, з улікам патрабаванняў Указа № 361, наймальнік мае права зрабіць ва ўстаноўленым парадку вяртанне або залік падаходнага падатку з фізічных асоб, які быў залішне ўтрыманы з сум перавышэння расходаў па найме жылога памяшкання над памерамі, вызначанымі заканадаўствам, пры выплаце ў 2014 годзе работніку такіх выдаткаў на камандзіроўкі. Тут спецыяліст удакладняе, што пры непадачы работнікам дакументаў, якія пацвярджаюць аплату расходаў па найме жылога памяшкання, вызваленню ад падаходнага падатку з фізічных асоб падлягаюць сумы такой аплаты ў межах нормаў (памераў), вызначаных заканадаўствам.

Аналагічны парадак падаткаабкладання прымяняецца да выплат, якія робяцца арганізацыяй членам органа кіравання, што прыбываюць (выязджаюць) для ўдзелу ў рабоце адпаведнага органа кіравання гэтай арганізацыі, а таксама да выплат, якія робяцца арганізацыяй фізічным асобам не па месцы асноўнай працы.

Указам устаноўлена, што калі работнік не падае дакументаў, якія пацвярджаюць аплату расходаў па найме жылога памяшкання, вызваленню ад падаходнага падатку падлягаюць сумы такой аплаты ў межах нормаў (памераў), вызначаных заканадаўствам. Заканадаўствам вызначана, што пры службовых камандзіроўках за мяжу ў гэтых выпадках аплата расходаў па найме жылога памяшкання ажыццяўляецца ў памеры 5% ад крайняй нормы расходаў па найме жылога памяшкання. Работнікам камерцыйных арганізацый такая аплата можа ажыццяўляцца ў памеры, які не перавышае 20% ад крайняй нормы расходаў па найме жылога памяшкання. Канкрэтны памер аплаты расходаў па найме жылога памяшкання вызначаецца наймальнікам.

**Сяргей КУРКАЧ**

# МІР У КОЖНЫ ДОМ

**Як Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа і неабыякавыя беларусы дапамагаюць грамадзянам, што прыбываюць з Украіны**

У беларускія аддзяленні Чырвонага Крыжа за некалькі апошніх месяцаў звярнуліся 5186 чалавек, якія прыбылі з Луганскай і Данецкай абласцей Украіны. Сярод іх ёсць шматдзетныя сем'і, 39 цяжарных жанчын і 513 пенсіянераў. На дапамогу ім ужо выдаткавана 300 мільёнаў рублёў. Дапамога ў памеры 400 тысяч беларускіх рублёў складаецца з прадуктаў харчавання і рэчаў першай неабходнасці: гэта мука, макарона, рыс, кансервы, сланечнікавы алей, ручнікі і гігіенічныя сродкі. Да таго ж БТЧК дапамагае прыбыўшым набываць білеты на праезд па Беларусі, супрацоўнічае з мясцовымі органамі ўлады па іх працаўладкаванні. Ёсць дамоўленасць з Беларускай чыгункай прадастаўляць магчымасць бясплатнага разавага начлегу ў прывакзальных гасцініцах. Уладкавацца ўкраінцам дапамагаюць улады на месцах, а таксама неабыякавыя грамадзяне (напрыклад, прыносяць дровы ці прадукты харчавання).



Здараецца, што людзі прыязджаюць з Украіны ў летнім адзенні. Ім патрэбны цёплыя рэчы і абутак. Тыя, хто жадае дапамагчы суседзям, могуць звярнуцца ў бліжэйшае аддзяленне Чырвонага Крыжа. Акрамя таго, ёсць нестандартныя выпадкі: напрыклад, некалькі прыбыўшых маюць вострую патрэбу ў пэўных медыкаментах, у інсуліне. БТЧК наладжвае супрацоўніцтва з Міністэрствам аховы здароўя Беларусі наконт бясплатнага інсуліну для хворых на дыябет.

Чакаецца, што ў Беларусь прыедуць яшчэ 3 тысячы грамадзян Украіны. Некаторыя з іх спачатку выехалі ў Расію, але потым вырашылі пераехаць у Беларусь, дзе, на іх думку, больш спрыяльныя сацыяльныя ўмовы. Часцей за ўсё выбіраюць Віцебскую вобласць.

Найбольшая колькасць украінскіх грамадзян прыбывае ў Гомельскую, Мінскую і Гродзенскую вобласці. Беларускае аддзяленне Чырвонага Крыжа ўпершыню сутыкаецца з такой колькасцю людзей, якія штодзённа звяртаюцца па дапамогу. Ужо сабрана 35 мільёнаў, якія паступілі ад фізічных асоб з Беларусі. Адзін жыхар Брэста ахвяраваў адразу 14 мільёнаў. Гэтыя грошы адразу ідуць на дапамогу; акрамя таго, ужо сёння трэба рыхтавацца да зімы і непрадбачаных сітуацый у выглядзе вялікіх маразоў і паводак у самой Беларусі.

Як яшчэ можна дапамагчы прыбыўшым з Украіны, можна даведацца, патэлефанаваўшы па нумары 201 з панядзелка па пятніцу з 19.00 да 21.00.

Пакуль многія, што з'ехалі з Украіны, не маюць магчымасці звязацца з тымі, хто застаўся дома. Будзе прасцей, лічаць у Чырвоным Крыжы, калі атрымаецца аднавіць сувязь з Луганскім аддзяленнем Чырвонага Крыжа.

Беларускі Чырвоны Крыж падрыхтаваў валанцёраў, якія займаюцца інфармаваннем грамадзян Украіны, куды і як ім звяртацца па дапамогу, працаўладкаванне і г. д.

— Вельмі важна, — адзначае **генеральны сакратар БТЧК Віктар КАЛБАНАЎ** *(на фота),* — каб людзі не сутыкаліся з выпадкамі бюракратызму, каб яны не «хадзілі па коле», а адразу атрымалі дакладную інфармацыю пра свае далейшыя дзеянні.

БТЧК ужо звярнулася па дадатковую фінансавую дапамогу ў Міжнародны Чырвоны Крыж Швейцарыі і Даніі. Плануецца атрымаць каля 500 тысяч швейцарскіх франкаў для падтрымкі тых, хто прыбывае з Украіны ў Беларусь.

**Алеся ВАРАБ'ЁВА.**

**Грашовыя ахвяраванні ад насельніцтва і арганізацый можна пералічыць на разліковы рахунак 30157740099012 ЦБП № 539 Белінвестбанк, БІК (МФА) 153001739, код 739 УНП 100265026 на імя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа з паметкай «Дапамога Украіне».**

■ Новая вышыня

# БДУ — у «вышэйшай лізе»

**Па выніках апублікаванага рэйтынгу ўніверсітэтаў свету вядомага брытанскага агенцтва QS (THE — QS World University Rankings) БДУ ўвайшоў у ТОП-500 лепшых універсітэтаў свету і размясціўся ў групе ВНУ, якія займаюць 491–500 пазіцыю. Упершыню за ўсю гісторыю ўдзелу ў сусветных рэйтынгах беларускі ўніверсітэт размясціўся так высока.**

Брытанскае агенцтва QS ужо 10 гадоў ранжыруе ўніверсітэты свету, і ў ТОП-ліст звычайна ўключаюцца толькі першыя 700–800 вышэйшых навучальных устаноў, або 3% ад усіх універсітэтаў свету.

Рэйтынг абапіраецца на аналіз звестак аб вышэйшай навучальнай установе і апытанні незалежных экспертаў. Ацэньваюцца акадэмічная рэпутацыя ўніверсітэта, вынікі апытанняў працадаўцаў, індэкс цытавання навуковых работ за апошнія пяць гадоў, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, колькасць замежных студэнтаў і выкладчыкаў.

Узначальвае рэйтынг Масачусецкі тэхналагічны інстытут (ЗША). За ім ідзе Кембрыджскі ўніверсітэт (Вялікабрытанія). З расійскіх ВНУ лепшыя, чым у БДУ, пазіцыі ў Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (114), Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта (233), МДТУ імя Баўмана (322) і яшчэ ў шасці ўніверсітэтаў.

З беларускіх ВНУ ў рэйтынгу QS прадстаўлены толькі Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (701+).

Вядучыя ўніверсітэты суседніх краін занялі ў рэйтынгу наступныя пазіцыі: Варшаўскі ўніверсітэт (335), Тартускі ўніверсітэт (379), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (421–430), Талінскі тэхнічны ўніверсітэт (501–550), Вільнюскі ўніверсітэт (551–600) і Латвійскі ўніверсітэт (701+).

Трэба дадаць, што БДУ ў апошнія гады прадстаўлены ў міжнародных рэйтынгах вельмі годна і пастаянна ўваходзіць у «вышэйшую лігу».

**Надзея НІКАЛАЕВА**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»*

**29 сентября 2014 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Мостоотряд №88»**

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

*1. О признании и утверждении результатов проведения закрытой подписки.*

*2. Об увеличении уставного фонда общества.*

*3. О принятии и утверждении решения о дополнительном выпуске акций общества.*

*4. О внесении изменений в устав общества.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 19 сентября 2014 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться – в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания с **15.30** до **15.55** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 29 сентября 2014 года в 16.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 18 сентября 2014 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 100299744

*Наблюдательный совет*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

17 верасня 2014 г.
№ 14 (335)


**ДАЛЁКАЕ — БЛІЗКАЕ**

## ІМЯ НА АБЕЛІСКУ

***Магілёўскі сельсавет дапамагае былому партызану з Малога Асаўца выдаліць яго прозвішча з помніка ў гонар загінулых у гады вайны***

Нэлі ЗІГУЛЯ

**Пра тое, што імя яе бацькі — Аляксея Паўлавіча Несцярэнкі — пазначана на мемарыяльнай пліце ў аграгарадку Махава, дачка Галіна даведалася зусім нядаўна. Бачыла, што на помніку ёсць прозвішча дзядзькі, але нават і думкі не дапускала, што там жа напісана і імя яго жывога брата. А тут як агнём апякло — ініцыялы ж супадаюць! Пачала разбірацца і высветлілася: на помніку памылка.**

Пра сваё мінулае былы франтавік не вельмі любіць узгадваць. Спачатку партызаніў, але ў 1944-м трапіў у палон. Памятае, як іх везлі, быццам жывёлу, у «цялятніках», як прымушалі працаваць на заможных палякаў, як марылі голадам і кармілі адной бручкай. Калі чырвонаармейцы іх вызвалілі, малады хлопец вырашыў не вяртацца дамоў. Ведаў добра: у Сталіна палонных няма, ёсць толькі ворагі. Усе, хто трапіў да немцаў, прыраўноўваліся да дэзерціраў. Трапіць з адной турмы ў другую не хацелася. Вось ён і рушыў з таварышамі спачатку на Урал, а потым у Сібір.

З тых часоў шмат гадоў мінула. Спрабуем разам з Аляксеем Паўлавічам аднавіць падрабязнасці яго ваеннага мінулага. У 1941-м яму якраз споўнілася 16 гадоў.


Дачка Галіна дакладна ведае: на помніку прозвішча яе бацькі

На фронт пайшлі старэйшыя браты Іван і Васіль, а ён, малодшы, застаўся з бацькамі і сёстрамі Дар'яй і Нінай. Немцы стаялі ў суседняй вёсцы, а ў Малы Асавец наведваліся час ад часу. Калі хлопец даведаўся, што ў суседнім лесе з'явіліся партызаны, разам з сябрам Валодзем Латушкіным падаўся да іх ваяваць. Камандаваў атрадам Дзямідаў, а штаб знаходзіўся ў слаўгарадскай вёсцы Хоцішча.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

**УСЁ Ў ПАРАДКУ**

## ПУСТУЮ ЗЯМЛЮ АДНІМУЦЬ ПРАЗ ГОД,

### а максімальны тэрмін будаўніцтва ўласнага дома складае 8 гадоў


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей КУРКАЧ

**Калі рухаешся са сталіцы па Лагойскай трасе, то вока радуе росквіт прыватнага будаўніцтва. Гэта або ўтульныя і прыгожыя дамкі або шыкоўныя катэджы з ландшафтным дызайнам. Аднак такая ідылія назіраецца далёка не на ўсіх тэрыторыях індывідуальнай забудовы... На самой справе бывае так, што на паперы зямельны ўчастак быццам і належыць камусьці, але сапраўднага гаспадара там няма. Гэтую праблему ўлады заўважылі і пачалі больш жорстка ставіцца да нядбайных уласнікаў зямельных участкаў. Пра нюансы зямельнага карыстання карэспандэнту «Звязды» расказаў начальнік аддзела прававога забеспячэння зямельных адносін, геадэзіі і картаграфіі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Аляксандр ПАЎЛАЎ.**

**— Тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і сёння маюць магчымасць атрымаць зямлю пад індывідуальнае будаўніцтва?**

— Так, участкі размяркоўваюць мясцовыя выканкамы. Трэба толькі адстаяць пэўны час у чарзе. Без чаргі ж зямельны ўчастак магчыма набыць на аўкцыёне — праўда, часам за даволі вялікія грошы. Ну а па-за чаргой зямельныя ўчасткі цяпер атрымліваюць толькі шматдзетныя сем'і. Дарэчы, сёння зямлю ў Мінску без аўкцыёнаў даюць толькі шматдзетным.

**— Дапусцім, першы крок у гэтым напрамку чалавек зрабіў — атрымаў участак. Які далейшы алгарытм дзеянняў уласніка такой зямлі?**

— Згодна з адпаведным указам № 667, грамадзянін **на працягу года пасля дзяржрэгістрацыі зямельнага ўчастка** павінен пачаць на ім будаўніцтва жылога дома. Індывідуальным прадпрымальнікам і юрасобам даецца на гэта яшчэ меншы тэрмін — шэсць месяцаў.

**— Што канкрэтна павінен зрабіць чалавек на працягу гэтага года?**

— Пасля рэгістрацыі ўчастка яго ўласніку неабходна атрымаць адпаведны дазвол на будаўніцтва. Трэба падрыхтаваць праект забудовы і пачаць яго рэалізоўваць. Было б добра выкапаць катлаван, закласці фундамент і прывесці на ўчастак будматэрыялы... Галоўнае, каб мясцовыя ўлады ўпэўніліся, што новы ўласнік сур'ёзна ставіцца да асваення гэтага зямельнага ўчастка.

**— Нормы ўказа кіраўніка дзяржавы № 87 гавораць аб тым, што жылы дом неабходна цалкам пабудаваць на працягу трох гадоў пасля дзяржрэгістрацыі зямельнага ўчастка. Аднак укласціся ў гэты тэрмін бывае цяжкавата...**

— Тры гады даецца забудоўшчыку на агульных падставах, калі ў яго не існуе фінансавых ці нейкіх іншых праблем. На практыцы ж мясцовыя ўлады маюць права падоўжыць гэты тэрмін — яшчэ максімум на два гады, а таксама ажыццявіць кансервацыю незавершанага будаўніцтва жылога дома — на тры гады. Атрымліваецца, што максімальны тэрмін будаўніцтва ў цэлым складае восем гадоў. Калі на працягу гэтых васьмі гадоў кліент так і не пабудаваў жылое памяшканне, то зямельны ўчастак у яго забяруць.

**— Што будзе з тэрмінамі будаўніцтва дома, калі гаспадар такога зямельнага ўчастка закансервуе незавершаны будынак, а потым прадасць гэты аб'ект на другасным рынку?**

— Адразу заўважу, што падобная здзелка куплі-продажу магчымая толькі ў тым выпадку, калі зямельны ўчастак пад індывідуальны жылы дом быў набыты на аўкцыёне. Новы ўласнік такога аб'екта павінен дакладна разумець, што разам з «незавершанкай» ён атрымлівае і абавязкі па ўзвядзенні жылога дома, што тэрміны па яго будаўніцтве не «абнуляюцца», а працягваюцца. І можа здарыцца так, што для новага гаспадара зямельнага ўчастка вышэйазначаны максімальны тэрмін узвядзення жылога дома (8 гадоў) скончыцца ўжо праз некалькі гадоў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

**«ЗА» І «СУПРАЦЬ»**

## У ВЁСЦЫ ЗАКРЫВАЮЦЬ МАГАЗІН...

***Калі гэта здарыцца, многія простыя рэчы, на якія не звяртаеш увагі ў паўсядзённасці, адразу стануць складанымі***

Святлана ЯСКЕВІЧ

**Вёска Коладна Камянецкага раёна — адна з тых, якія называюць неперспектыўнымі. Хоць узвялі ў свой час тут некалькі дамоў па прэзідэнцкай праграме, усё ж сталых жыхароў, паводле інфармацыі сельвыканкама, усяго 62 чалавекі. Пры гэтым пенсіянераў больш, чым людзей працаздольнага ўзросту. З усіх сацыяльных і іншых аб'ектаў інфраструктуры ёсць толькі магазін. Але людзям аб'явілі, што з 1 лістапада ён зачыняецца. Гэта і стала прычынай тэлефоннага звароту жыхароў вёскі ў карпункт газеты.**

— У нас праводзілі сход, — гаворыць пенсіянерка Лідзія Асіпук. — Нам паўтары гадзіны распавядалі, як будзе добра, калі магазін зачыняць і ў вёску будзе прыязджаць аўтакрама. Але ж гэта не так. Вось сёння я пайшла ў наш гандлёвы пункт, усяго накупіла: хлеба, малака, каўбасы, пячэння, прыправ, накрывак для закаткі. Потым прыйшла дадому, стала варыць абед і раптам агледзела, што солі няма ні грама. Пабегла купіла. Дык што, тая машына будзе нас чакаць?




Прадавец Іна Яфімава.

— Некаторыя мае суседкі, старэйшыя за мяне, скардзяцца, што яны нічога не ўбачаць у высокай вітрыне, асабліва калі позняй восенню пачне рана цямнець, — працягвае Лідзія Іванаўна. — А ў будынку мы разгледзім увесь тавар, распытаем прадаўца. Яна ж наша, з мясцовых, цярпліва адказвае на пытанні кожнай пенсіянеркі, падказвае, які тавар свяжэйшы, што па якой цане выгадна браць. Прадаўцу з аўтакрамы няма часу на доўгія тлумачэнні, у іх задача хутка абслужыць і пераехаць у наступную вёску.

Дарэчы, пра Іну Яфімаву, прадаўца названай крамы, вяскоўцы адгукаюцца толькі станоўча. Усіх ведае, ветлівая і добразычлівая, па цотных днях яе ўжо чакаюць тут. Крама працуе праз дзень, і людзі часта збіраюцца за некалькі хвілін, а то і за паўгадзіны да яе адкрыцця.

Шчырае шкадаванне з нагоды закрыцця крамы выказала і Настасся Бас. Настасся Уладзіміраўна жыве з сям'ёй сына. І хоць трымае вялікую падсобную гаспадарку, мае многа сваіх прадуктаў, але ж краму наведвае кожны раз, калі яна адкрытая. Нават малому які ласунак купіць, і тое добра. Ды і ці мала якая патрэба ўзнікае ў хатняй гаспадарцы.

Асартымент у мясцовай краме вясковыя жанчыны ахарактарызавалі двума словамі: усё ёсць.

Пенсіянеркі прыводзілі новыя і новыя аргументы на карысць стацыянарнага гандлёвага пункта. Да адной з суседак, напрыклад, раптам завіталі госці. Акрамя традыцыйнага набору прадуктаў, яна яшчэ купіла ў краме камплект пасцельнай бялізны. Любая гаспадыня скажа, што такая рэч лішняй у хаце не акажацца і добра, калі ўсё ў патрэбны час пад рукой. Да другой унучка зазірнула, якая летам паступіла ва ўніверсітэт. Бабуля ёй, акрамя іншага, ручнік вялікі махровы вырашыла падарыць, збегала і купіла яго. Гэта простыя рэчы і для вяскоўца, і для гараджаніна, якія стануць складанымі, калі ў вёсцы закрыюць стацыянарны гандлёвы пункт.

Не згодны вяскоўцы з пазіцыяй прадстаўніцы раённага спажывецкага таварыства, якая прысутнічала на сходзе. Чамусьці яна сказала, што на ацяпленне магазіна трэба ажно 5 тон брыкету, плюс даплата прадаўцу за тое, што ён паліць у печы. Лідзія Асіпук сцвярджае, што яны з мужам купляюць тры тоны брыкету, паляць у дзвюх печках кожны дзень, і ў іх застаецца паліва. Печка ў магазіне прапальваецца раз на два дні. А даплата за гэтую работу складае... 80 тысяч рублёў у месяц.

Іншая справа, што дастаўка прадуктаў у населены пункт, які знаходзіцца ў трох кіламетрах ад шашы, выглядае стратным мерапрыемствам. Пра гэта ў гутарцы з карэспандэнтам «МС» гаварыў **старшыня Камянецкага раённага спажывецкага таварыства Васіль МІХАЛЮК.**

— Закрыццё такіх малых нерэнтабельных магазінаў — мера вымушаная, — сказаў Васіль Мікалаевіч. — Гандлёвы пункт стратны. Мы ўзважвалі ўсе «за» і «супраць», перш чым прыняць рашэнне аб пачатку працэдуры закрыцця. Першы сход прайшоў не вельмі ўдала. На другі сход, прызначаны на 18 верасня, паеду асабіста. Будзем разам з мясцовай уладай угаворваць, пераконваць людзей. Іншага выйсця няма. У маёй практыцы быў выпадак, калі ў адной вёсцы сход праводзілі чатыры разы. І ўсё роўна засталіся незадаволеныя. А потым, калі прайшоў час, давялося гутарыць з пакупнікамі. Яны не выказвалі нараканняў.

> **Ва ўсіх бакоў у гэтай гісторыі — свая праўда. Службовыя асобы прыводзяць важкія аргументы, з якімі цяжка не пагадзіцца. А жыхары вёскі лічаць, што якасць іх жыцця пагоршыцца.**


Крама ў вёсцы Коладна.

Аўтакрама прыходзіць па графіку, асартымент стараемся захоўваць добры. Прадаўцы прымаюць папярэднія заяўкі на тавары прамысловай групы.

Сёння 9 нашых аўтакрам абслугоўваюць 186 малых вёсак. Стараемся максімальна ўлічваць просьбы пакупнікоў. У адной з вёсак, расцягнутай удоўж, зрабілі некалькі прыпынкаў аўтакрамы. Дык некаторыя старэнькія бабулькі цяпер гавораць: «Нам былы магазін не патрэбен, мы да яго не дайшлі б». А што датычыць гандлёвага пункта ў вёсцы Коладна, будзем гутарыць з людзьмі, пакуль не ўдасца іх пераканаць. Нават калі гэта зацягнецца на большы тэрмін, чым папярэдне пазначанае 1 лістапада.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

**ЁСЦЬ ПЫТАННЕ**

## А ЗНОС І СЁННЯ ТАМ

***Калі трухлявыя дамы перастануць быць «галаўным болем» для мясцовых жыхароў?***

**Зарослыя па самы дах вербалозам і крапівой, шэрыя, сточаныя шашалем будынкі, не ўпрыгожваюць сельскія краявіды. Хіба выпадковы фатограф зробіць пару кадраў са старым разбітым збанам на фоне напаўразваленага дома. Або зловіць адлюстраванне заходзячага сонца ў разбітай шыбе маленькага акенца. Ды аматары даўніны, «чорныя капальнікі», зазірнуць туды ў пошуках старажытных рэчаў ды прыхаваных былымі гаспадарамі скарбаў... Для астатніх такое вось трухлявае, забытае жыллё — суцэльны галаўны боль.**

Мінусы яго можна пералічваць доўга. У якой вёсцы нейкая пустуючая хата не была аблюбавана падлеткамі? Бо тут, удалечыні ад бацькоўскіх вачэй, так зручна пасваволіць — пакурыць або ўпершыню паспрабаваць моцны напой. Добра, калі падлеткавыя забавы не заканчваюцца бядой. Састарэлы дом небяспечны — і абваліцца можа, і загарэцца. А там і да чалавечых ахвяр недалёка. Калі дом стаў «гняздом» для бамжоў, ён ператвараецца ў рассаднік інфекцыйных захворванняў, і, зноў-такі, ёсць небяспека ўзнікнення пажараў.

А яшчэ, прыкрытыя зараснікамі быльнягу ад усюдыісных суседзяў, такія будынкі як магнітам прыцягваюць не толькі бамжоў і падлеткаў. Напрыклад, у вёсцы Макашы Баранавіцкага раёна нежылы дом выкарыстоўвалі для вырабу наркотыку — амфетаміну. Супрацоўнікі міліцыі «накрылі» лабараторыю гэтым летам, знайшоўшы ў 28-гадовага дзялка 16 грамаў наркотыку і каля 300 грамаў — сыравіны (так званага прэкурсора) для перапрацоўкі, а яшчэ — лабараторнае абсталяванне і рэактывы.

Прагартаўшы падшыўкі газет за мінулыя гады, можна знайсці не адно апісанне здарэнняў і злачынстваў, учыненых у гэтых развалюхах: і калецтвы, і бойкі, калі сабутэльнікі чагосьці не падзялілі, і нават забойствы...

І працэс складання рэгістра старых і пустуючых будынкаў, і працэс выяўлення іх гаспадароў, і працэс рэканструкцыі або зносу трухлявых дамоў дасканала апісаны ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэння колькасці пустых і старых дамоў у сельскай мясцовасці» ад 23 лютага 2012 года. Алгарытм дзеянняў мясцовай улады прапісаны ад «а» да «я», літаральна раскладзены па паліцах. Бяры ў рукі закон, як той казаў, і дзейнічай. Аднак не ўсё так проста.

— У рэестр унесены далёка не ўсе будынкі, часам там няма хат, міма якіх кожны дзень ходзяць той ці іншы старшыня сельвыканкама, кіраўнік справамі, стараста вёскі... Чаму? Думаю, з-за элементарнай адсутнасці зацікаўленасці. І не цікава, і не выгадна сельвыканкамам займацца гэтай працай, — каментуе праблему старшыня Баранавіцкага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю па Брэсцкай вобласці Алег Данілаў.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. У Баранавіцкім раёне з запланаваных да зносу ў першым паўгоддзі 19 старых будынкаў знесена толькі 11. Два дамы не знесены, напрыклад, у Сталовіцкім сельсавеце. Еду ў вёску Стайкі — палюбавацца, так бы мовіць, на развалюху, якая выстаяла, нягледзячы на планы і рэестры, па вуліцы Мірнай, 81. І знаходжу на гэтай жа вуліцы... яшчэ тры такія ж хаты! Яны ўраслі акенцамі ў зямлю, раз'язджаюцца па бервяну. У іх не тое што жыць — побач знаходзіцца небяспечна. У вёсках, куды па дарозе заязджаю, таксама хапае гэтакага — то тут, то там. Цікава, чаму гэтых хат не бачаць адказныя чыноўнікі? А галоўнае, чаму не зносяць тое, што ўжо выявілі?

— У нашым бюджэце на гэта няма сродкаў, — тлумачыць мне сітуацыю з вёскай Стайкі старшыня Сталовіцкага сельскага Савета Вячаслаў Ланкуць. — Няма ў мяне лішніх 30 мільёнаў, а менавіта столькі запытвае за знос дома Баранавіцкае ПМС (прадпрыемства меліярацыйных сістэм).

Колькі наогул паступіла з раённага бюджэту грошай на знос старых будынкаў, Вячаслаў Адольфавіч не ў курсе. Сказаў, што «ва ўладзе» ўсяго 3 месяцы, а за дзеянні папярэдніка не адказвае.

Зрэшты, дамы ж не толькі ў гэтым сельсавеце не зносяцца па графіку. На адсутнасць сродкаў скардзіліся многія. Скардзіліся і на тое, што існуюць пэўныя цяжкасці ў пошуку гаспадароў будынкаў. Часам ледзь не па дзясятку запытаў дасылаюць, размяшчаюць аб'явы ў газетах, а вынік — нулявы. Дзеля справядлівасці адзначу, што сярод 14 сельсаветаў раёна толькі ў 5 узніклі праблемы са зносам выяўленых будынкаў. Астатнія і гаспадароў шукаюць, і старыя будынкі своечасова адчужаюць, і сродкі на знос знаходзяць.

— У бюджэце з пачатку года запланавана 100 мільёнаў рублёў менавіта на знос старых будынкаў, — адказала на мае роспыты Валянціна Скараход, начальнік аддзела ЖКГ Баранавіцкага райвыканкама. — Але калі патрабуюцца дадатковыя сродкі, то фінаддзел выдаткоўвае іх па звароце з сельвыканкама. Праўда, з пачатку года такіх зваротаў было толькі два.

Астатнія сельвыканкамы інфармацыю аб магчымасці звароту ў фінаддзел ці то не пачулі, ці то не захацелі пачуць.

Яшчэ, растлумачылі мне ў ЖКГ, заўсёды можна дамовіцца з сельгасарганізацыямі, якія бяруцца знесці дом на ўзаемавыгадных умовах. Напрыклад, вылічыць з кошту работ кошт драўніны, якой пасля зносу заўсёды застаецца досыць. Многія, дарэчы, так і робяць. Гэта дапамагае значна эканоміць сродкі сельсавета па ліквідацыі старых будынкаў. І гэтую інфармацыю да мясцовых кіраўнікоў не раз даводзілі. І зноў, мяркуючы па выніках працы некаторых сельвыканкамаў, міма?..

**Таццяна ГРЫНКЕВІЧ.**







**На фота: пустуючыя хаты ў вёсцы Стайкі.**

# ПУСТУЮ ЗЯМЛЮ АДНІМУЦЬ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Для іншых катэгорый уласнікаў (калі ўчастак быў набыты не праз аўкцыён) існуюць пэўныя абмежаванні па продажы падобнай маёмасці. Напрыклад, калі зямельны ўчастак быў прадастаўлены чалавеку мясцовымі ўладамі як чаргавіку, то створаны на зямельным участку аб'ект можа быць прададзены толькі праз 8 гадоў пасля дзяржрэгістрацыі такога дома. Гэта зроблена дзеля таго, каб зямельныя ўчасткі атрымлівалі менавіта рэальныя чаргавікі, а не «звышпрадпрымальныя» асобы для стварэння шэрых схем па продажы зямлі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**— Для дачнікаў існуюць крыху мякчэйшыя «зямельныя» патрабаванні?**

— Карыстальнік зямельнага ўчастка ў складзе садоўніцкага таварыства можа пабудаваць сабе садовы домік, але можа гэтага і не рабіць. У яго ёсць права гэтым займацца, але гэта не з'яўляецца абавязковым патрабаваннем. Тут галоўным фактарам з'яўляецца выкарыстоўванне ўчастка па мэтавым прызначэнні. Участак павінны даглядаць: наводзіць там парадак, вырошчваць садавіну і агародніну і г. д. Калі падобны зямельны ўчастак на працягу года пустуе, то ўжо на наступны год старшыня таварыства павінен звярнуцца ў мясцовы сельскі Савет, які мае права гэту зямлю адабраць і пераразмеркаваць. Такі механізм тычыцца зямлі, якая знаходзіцца ў пажыццёвым карыстанні. Лёс зямельных участкаў, набытых у прыватную ўласнасць, у гэтым выпадку вырашае суд.

**— Налета забароняць стварэнне новых садоўніцкіх таварыстваў і дачных кааператываў у прыгараднай зоне сталіцы...**

— Так, аб гэтым, у прыватнасці, гаворыцца ва ўказе кіраўніка дзяржавы № 387, дзе ўдасканальваецца парадак прадастаўлення зямельных участкаў. Такая норма ўказа датычыцца таварыстваў і кааператываў у прыгараднай зоне Мінска — за выключэннем новых структур, якія ствараюцца пасля рэарганізацыі існуючых садоўніцкіх таварыстваў і дачных кааператываў. Больш за тое, цяпер у прыгараднай зоне сталіцы свабодныя (незанятыя) зямельныя ўчасткі на тэрыторыі існуючых садоўніцкіх таварыстваў і дачных кааператываў прадастаўляюцца грамадзянам толькі па выніках спецыялізаваных аўкцыёнаў.

Каб зняць усе праблемныя пытанні і навесці парадак на зямлі ў садоўніцкіх таварыствах і дачных кааператывах, з першых дзён наступнага года прынятым указам прадугледжваецца абмежаванне адчужэння ў прыгарадных зонах Мінска і абласных цэнтраў зямельных участкаў, якія прадастаўлены людзям для калектыўнага садаводства і дачнага будаўніцтва.

**— Што гэта азначае на практыцы для садаводаў?**

— Цяпер зямельныя ўчасткі ў садоўніцкіх таварыствах і дачных кааператывах забараняецца прадаваць, дарыць ці мяняць на працягу 5 гадоў пасля ўзнікнення правоў на гэту нерухомасць. Падкрэслю асобна, што забарона дзейнічае на працягу 5 гадоў пасля афармлення дзяржаўнай рэгістрацыі на такі зямельны ўчастак. Напрыклад, калі зямельны ўчастак у садоўніцкім таварыстве быў атрыманы чалавекам, скажам, 15 гадоў таму, пасля чаго ён быў цалкам аформлены з дзяржаўнай рэгістрацыяй, то сёння адчужаць яго можна. А вось калі ўчастак атрымаў дзяржрэгістрацыю толькі год таму ці ўчора, тады неабходна будзе вытрымаць пяцігадовы тэрмін.

**— Мне здаецца, што такая норма прымусіць карыстальнікаў загарадных «сотак» больш актыўна рэгістраваць зямельныя ўчасткі ў складзе садоўніцкіх таварыстваў...**

— Тут магу заўважыць, што падобная норма тычыцца зямельных участкаў толькі ў прыгарадных зонах Мінска і абласных цэнтраў, і пачынае яна дзейнічаць з 1 студзеня 2015 года.

Асобна ў дакуменце дадзена даручэнне аблвыканкамам сёлета да 1 верасня з улікам інтарэсаў дзяржавы, мясцовых умоў і эканамічнай эфектыўнасці пашырыць пералік населеных пунктаў, у межах якіх зямельныя ўчасткі могуць прадастаўляцца толькі па выніках аўкцыёнаў.

## Даведка

* Юрыдычная асоба, індывідуальны прадпрымальнік на працягу шасці месяцаў, а грамадзянін на працягу аднаго года з дня дзяржаўнай рэгістрацыі стварэння зямельнага ўчастка і ўзнікнення права на яго абавязаны заняць дадзены ўчастак у адпаведнасці з мэтай і ўмовамі яго прадастаўлення (пачаць будаўніцтва). Пачаткам будаўніцтва лічыцца ажыццяўленне будаўніча-мантажных работ у адпаведнасці з зацверджанай праектнай дакументацыяй.

* Тэрмін забудовы зямельнага ўчастка, прадастаўленага для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, дачнага будаўніцтва, складае 3 гады з даты дзяржаўнай рэгістрацыі права прыватнай уласнасці, пажыццёвага валодання або арэнды на зямельныя ўчасткі. Тэрмін забудовы можа быць падоўжаны мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, але не больш чым на 2 гады, з улікам матэрыяльнага становішча грамадзяніна і іншых уважлівых прычын (хвароба, адсутнасць у Рэспубліцы Беларусь або інш.) па яго заяве, пададзенай не раней чым за шэсць месяцаў, але не пазней чым за два месяцы да заканчэння тэрміну будаўніцтва.

* Таксама ў выпадку немагчымасці завяршэння будаўніцтва ва ўстаноўленыя тэрміны грамадзянін абавязаны ажыццявіць кансервацыю незавершанага жылога дома, дачы і добраўпарадкаванне зямельных участкаў, на якіх размешчаны такія дом ці дача. Пры гэтым кансервацыя жылога дома, дачы можа быць ажыццёўлена ў дачыненні да канкрэтнага аб'екта будаўніцтва толькі адзін раз, а тэрмін такой кансервацыі не можа перавышаць трох гадоў.

# ІМЯ НА АБЕЛІСКУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Падлеткам давяралі сцерагчы палонных, збіраць зброю. Ён і сёння памятае тую аўтаматычную вінтоўку, у якой пры стралянні часам нешта «заядала». А вось у рэйкавай вайне прымаць удзел не даводзілася. Узрыўчатку падкладалі больш вопытныя партызаны, а моладзь тым часам стаяла на варце.

Перажыць прыйшлося шмат чаго. І смерць у твар глядзела неаднаразова. Немцы час ад часу бамбілі лясы, але ліся жыхары, якія спецыяльна пяклі для партызанаў хлеб і насілі ў лес.

Аднойчы ў Камарыцкіх лясах на Быхаўшчыне атрад трапіў у акружэнне, і кожнаму трэба было выходзіць паасобку. Аляксей разам са сваім сябрам паплылі праз рэчку, спадзеючыся абсохнуць у вёсцы на другім беразе. Была ўжо глыбокая восень, вада халодная. Але калі выйшлі на бераг і ўбачылі немцаў, кінуліся ў рэчку зноў.

Як толькі не прыходзілася ратавацца. Зайшоў Аляксей неяк дамоў, а немцы тут як тут. Залез на печку, маці з краю прыкрыла. Але ж тыя ўбачылі хлопца і паклікалі — «ком цу мір». Маці давай лямантаваць: гэта ж дзіця хворае, можаце заразіцца. Тыя спужаліся і не сталі яго чапаць.




У гонар абаронцаў і вызваліцеляў.

хлопцам шчасціла. На памяць аб тым цяжкім часе засталіся толькі шрамы на руцэ, сляды ад асколкаў. Былы партызан памятае, як прыйшлося палкай выкалупваць жалязякі з крывавай раны. Было нясцерпна балюча, але ж затое выжыў. Хоць на яго вачах баявога таварыша разарвала на часткі.

Часам так хацелася есці, што ад голаду ногі заплятаблагіся. Сілкаваліся чым Бог пашле, часцей за ўсё гнілой бульбай ці вараным на агні жытам. Мясцовае насельніцтва дзялілася правіянтам, але ім і самім часта не было чаго есці. Знаходзі-

А калі раён вызвалілі, Аляксей разам з арміяй адправіўся на фронт. Але на тэрыторыі Польшчы трапіў у палон.

На радзіму вярнуўся толькі ў 1954 годзе. Пісаў дадому, што жывы, але лісты чамусьці не даходзілі. І калі маці ўбачыла свайго сына, не магла паверыць вачам. Потым доўга плакала ад шчасця. Старэйшы яе сын Іван загінуў, а пра Аляксея прыйшоў ліст, што знік без вестак. А ён, дзякуй Богу, застаўся жывы. Даведалася, што сын пасля вайны жыў у Магадане, вывучыўся на сувязіста, працаваў на тэлефоннай станцыі. На жаль, з бацькам пабачыцца «ўваскрэсламу» сыну не давялося. Той памёр у 1949 годзе.

На радзіме знайшоў сабе нявесту, а ў 1955 годзе ў сям'і нарадзіўся першынец. Будаваў дом, гадаваў дзяцей, працаваў і не ведаў, што ў афіцыйных спісах па-ранейшаму значыўся загінулым. Яго сябар Уладзімір Латушкін некалькі гадоў таму ўсё ж пацвердзіў сваё дачыненне да партызанскага атрада. А Аляксей Паўлавіч падумаў: навошта варушыць мінулае? І калі б не дачка, якая ўбачыла яго прозвішча на помніку, напэўна, усё так і засталося б. Дарэчы, Аляксей Несцярэнка лічыцца загінулым і ў кнізе «Памяць» Магілёўскага раёна. Але калі тое, што ўжо надрукавана, не выкрасліш, то памылку на помніку можна і трэба прыбраць. Па дапамогу жанчына звярнулася да старшыні Махаўскага сельсавета Валянціны Камленкі. Як патлумачыла старшыня, на адрас абласнога ваенкамата ўжо накіравана пісьмо з прапановай вырашыць пытанне. Але гэта справа не аднаго дня, паведамілі там. Трэба яшчэ ідэнтыфікаваць, ці той гэта чалавек наогул.



Аляксей Паўлавіч упэўнены, што памылку выправяць.

**Фота аўтара.**

**Гісторык, кіраўнік абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага атрада ВІККРУ Мікалай БАРЫСЕНКА:**

— Гэта не першы інцыдэнт, калі імя жывога чалавека наносіцца на помнік. У той жа магілёўскай Цішоўцы на помніку ў гонар загінулых падчас абароны Магілёва байцоў і камандзіраў 172-й стралковай дывізіі значыцца прозвішча капітана Дзмітрыя Гаўрушына. Таго самага, якога ў 41-м на свяшчэнным для кожнага магілёўца Буйніцкім поле сфатаграфаваў фотакарэспандэнт газеты «Известия» Павел Трошкін. Гаўрушын вярнуўся дадому, нават перапісваўся з Канстанцінам Сіманавым. Памёр ад ран у 1953 годзе. Але ж на помніку датай яго смерці так і застаўся 1941 год. Мне здаецца, што выправіць памылку ў выпадку з Аляксеем Несцярэнкам не будзе чымсьці складаным. Каб афіцыйна пацвердзіць словы былога партызана, яго дачцэ трэба звярнуцца ў Нацыянальны архіў Беларусі, дзе знаходзяцца дакументы 15-га партызанскага палка Аляксандра Дзямідава, і адначасова зрабіць запыт у Падольскі архіў. У інтэрнэце на АБД «Мемарыял» таксама можна знайсці інфармацыю пра загінулых і зніклых без вестак у перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе.

Дарэчы, там значыцца, што Аляксей Несцярэнка ваяваў у складзе 173-й стралковай дывізіі і знік без вестак на тэрыторыі Польшчы. Архіўныя дакументы паслужаць падставай для атрымання пасведчання ўдзельніка альбо ветэрана вайны.

# У ВЁСЦЫ ЗАКРЫВАЮЦЬ МАГАЗІН...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

**Старшыня Камянецкага райвыканкама Андрэй ПІСАРЫК** сказаў, што вось гэтая сітуацыя яскрава адлюстроўвае дэмаграфічную карціну вёсак раёна. У раёне, сярэднім па рэспубліканскіх мерках, частку якога займае Белавежская пушча, — 234 населеныя пункты. Большасць з іх мае колькасць жыхароў, меншую за 50 чалавек.

— Калі я прыйшоў на гэтую пасаду пяць гадоў таму, у раёне была адна аўтакрама. Цяпер купілі 10-ю машыну. І за рэдкім выключэннем працэс закрыцця магазінаў праходзіць хваравіта. Людзі ўспрымаюць свой гандлёвы пункт яшчэ і як сацыяльны аб'ект, дзе можна сабрацца, пагаманіць, абмяняцца навінамі. Але апошнім часам мы сутыкаемся з праблемай, што цяжка нават знайсці прадаўца на такую зарплату, якую спажыўтаварыства можа плаціць работніку нерэнтабельнага магазіна.

***

Ва ўсіх бакоў гэтай гісторыі — свая праўда. Службовыя асобы прыводзяць важкія аргументы, з якімі цяжка не пагадзіцца. Жыхары вёскі лічаць, што якасць іх жыцця пагоршыцца. І гэта так. І пра сацыяльны аб'ект праўда. У Коладна няма ні школы, ні клуба, ні пошты, да іх у вёску нават аўтобус не ходзіць. Магазін — адзінае, што звязвала нейкім чынам вяскоўцаў з буйнымі населенымі пунктамі. Часам людзі выказваюцца вельмі эмацыянальна, калі гавораць пра тое, што жыццё на гэтай зямлі адпрацавалі і не заслужылі мінімальных сацыяльных набыткаў. А яшчэ яны казалі, што тыя, хто прымае рашэнні, жывуць у гарадах і маюць магчымасць нават выбіраць сабе гандлёвае прадпрыемства з мноства тых, якія нібы грыбы растуць на асфальце. А паспрабавалі б яны іншыя ўмовы...

І яшчэ. У адным з раёнаў вобласці неяк адначасова скардзіліся кіраўнікі гандлю, адукацыі і пошты, што старшыня райвыканкама не дазваляе закрываць «нерэнтабельныя аб'екты» ў малых вёсках. Менавіта кіраўнік раёна быў там стрымальным фактарам. Так што не ўсё і не заўсёды можна спісаць на нізкую рэнтабельнасць... Праўда, той старшыня крыху больш за год таму пайшоў на павышэнне. Стрымальнага фактара больш няма.

## НАВІНЫ З РЭГІЁНА

### Землякі

На **Нараўляншчыне** прайшла сустрэча землякоў — былых кіраўнікоў мясцовай улады, прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, якія працавалі тут да аварыі на ЧАЭС і аднаўлялі рэгіён адразу пасля яе. Госці пабывалі ў ААТ «Чырвоны Мазыранін», спецлясгасе, на сядзібе таленавітага разьбяра па дрэве Каробскага... Важнай для ўсіх стала сустрэча са старшынёй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімірам Дворнікам, які свой працоўны шлях пачынаў таксама ў Нараўлянскім раёне.

### Вяртанне

Сёлета на сельгаспрадпрыемствы **Хойніцкага** раёна прыйшлі працаваць 26 маладых спецыялістаў, з іх 18 — мясцовыя ўраджэнцы. Раённыя ўлады распыталі іх пра тое, як уладкаваліся на першым месцы працы, што радуе і засмучае, з якімі складанасцямі сутыкаюцца. Маладым людзям расказалі аб магчымасцях паляпшэння жыллёвых умоў, атрыманні спажывецкага крэдыту, усіх належных выплатах і арганізацыі вольнага часу.

### Расчыстка

«Ахова птушак Бацькаўшчыны» арганізавала добраахвотніцкі лагер па расчыстцы заказніка «**Тураўская сенажаць**» ад хмызняку. Да таго ж сёлета тут пасвіўся статак у 150 галоў. Вялізныя «лімузіны» (так называецца парода кароў) з задавальненнем аб'ядалі лазу і вярбу, якімі зарастаюць гэтыя месцы. Арганізацыя экстэнсіўнай пашы для буйной рагатай жывёлы, кашэнне, а таксама прыбіранне драўнінна-хмызняковага маладняку ўключаны ў план кіравання біялагічным заказнікам мясцовага значэння «Тураўская сенажаць».

### Падарунак

Сучасную спартыўную пляцоўку са штучным пакрыццём у падарунак да навучальнага года атрымалі вучні Запясоцкай базавай школы-садка, што ў **Жыткавіцкім** раёне. Добраўпарадкавана і тэрыторыя перад школай. На месцы цяперашняй спартыўнай пляцоўкі раней быў школьны агарод. Ля школы з'явіліся пешаходныя дарожкі, уздоўж іх высаджаны туі, заасфальтавана пляцоўка ля ганка, зроблены лаўкі, дзіцячая пляцоўка з альтанкай. На ўсе пераўтварэнні выдаткавана каля трох мільярдаў рублёў.

### Смак мёду

У аграгарадку Забалоцце **Рагачоўскага** раёна дэбютаваў фестываль «Смак мёду». Падчас яго можна было паласавацца дарункамі пчол і набыць унікальныя сувеніры. Мерапрыемства прайшло ў рамках еўрапейскай ініцыятывы. Кіраўнік праекта «Свет інфармацыі, культуры і творчасці для ўсіх» Ірына Седлер адзначыла, што ініцыятыва мясцовых жыхароў падтрымана пры ўдзеле сродкаў гранта Еўрасаюза.

### Напамін

У вёсцы Тонеж **Лельчыцкага** раёна ля мясцовага храма ў гонар св. Мікалая Цудатворца высаджана 108 дрэўцаў карэльскай бярозы. Колькасць сімвалічная — менавіта столькі непаўналетніх дзяцей былі жывымі спалены ў будынку царквы ў 1943 годзе. Усяго (разам з дарослымі) у полымі загінулі 263 мірныя жыхары населенага пункта.

### Паядынак

Гранітны камень вагой амаль у 20 тон усталяваны на месцы **Лоеўскай** бітвы, якая адбылася ў гэтых мясцінах у 1649 годзе. Памятны знак прысвечаны падзеям казацка-сялянскай вайны 1648-1651 гадоў, якая ўспыхнула на Украіне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага і ахапіла раёны паўднёвай і паўднёва-ўсходняй Беларусі. Тады ля Лоева ў смяротным паядынку сутыкнуліся казацка-сялянскае войска палкоўніка Міхаіла Крычаўскага і войска Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем польнага гетмана ВКЛ Януша Радзівіла. З абодвух бакоў у бітве прынялі ўдзел больш за 50 тысяч чалавек, каля 12 тысяч ваяроў загінулі.

### Дзень вёскі

У Чкалава **Гомельскага** раёна адсвяткавалі дзень вёскі. Гэты населены пункт у пісьмовых крыніцах упамінаецца яшчэ ў XVIII стагоддзі як вёска Жаробнае ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. Сёлета арганізатары свята правялі тут конкурс кветкавых кампазіцый «Кветкі малой радзімы».

Лельчыцкім **Ліплянам** споўнілася 392 гады. Свята стала нагодай, каб сказаць дзякуй самым актыўным. Цёплыя словы былі адрасаваны самым старым і самым юным. Падарункі атрымалі жыхары, якія ўтрымліваюць падворкі ў ідэальным парадку. Не забылі і хлебаробаў ААТ «Новая ніва», якія намалацілі больш за ўсіх у раёне збожжа.

Пасёлак **Бальшавік** Гомельскага раёна, які быў заснаваны ў 30-я гады мінулага стагоддзя, таксама адсвяткаваў свой дзень народзінаў. Калісьці тут, на месцы Кабылянскага балота, пачаліся торфараспрацоўкі і было створана торфапрадпрыемства «Бальшавік». Торф патрэбен быў для размешчанага непадалёк Гомельскага шклозавода.

Жыхары вёскі **Колпень** Лоеўскага раёна ў дзень свята павіншавалі дзве сям'і, якія сёлета адзначаюць залатое вяселле: Дзмітрыя і Кацярыны Гайдукоў і Рыгора і Алены Андрэяўцоў. Таксама падзякавалі добрасумленным гаспадарам, чые домаўладанні з'яўляюцца ўзорнымі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЦІКАВАЕ ПОБАЧ

# ЦІ БЫЛІ ВЫ «У МАРОЗА»?

***У Маладзечанскім раёне, у вёсцы Талуі Маркаўскага сельсавета, знаходзіцца адзіны ў краіне музей сячкарняў***

**Сабраў калекцыю старадаўніх сельскагаспадарчых інструментаў на аграсядзібе «У Мароза» яе гаспадар Уладзімір Анатольевіч.**

— Першая сячкарня з'явілася на маім падворку прыкладна 5 гадоў таму, — гаворыць Уладзімір Мароз. — Дасталася яна мне ад бабулі. Потым на просьбу прадаць або аддаць рарытэтныя прылады адгукнуліся сябры і знаёмыя. Па некаторыя сячкарні давялося ездзіць у іншыя раёны Мінскай і Гродзенскай абласцей. Пастухова калекцыя вырасла да 87 экспанатаў, па якіх можна вывучаць гісторыю і геаграфію.



Фота Аляксея ПЛАТКО.

У музеі Уладзіміра Анатольевіча ёсць сячкарні — спецыяльныя прылады для нарэзкі, здрабнення грубых кармоў ці раслін — выробленыя ў Расіі, Польшчы, ЗША, Германіі, Францыі, Бельгіі, Італіі. Ёсць нават разборная сячкарня, якая «служыла» ў кавалерыі ў час Першай сусветнай вайны.

— Самаму старому музейнаму экспанату больш за 200 гадоў, — адзначыў гаспадар аграсядзібы. — Амаль усе дэталі гэтай сячкарні зроблены з дубу. Каб яе вырабіць, майстрам спатрэбіўся цэлы год. Згодна з тэхналогіяй, дубовыя брусы гнулі і надавалі ім пэўную форму. Ды яшчэ рыхтавалі некалькі дзясяткаў спецыяльных шпунтоў. Арцель, што спецыялізавалася на вырабе драўляных сячкарняў, знаходзілася на тэрыторыі сучаснага Валожынскага раёна.

Па словах Уладзіміра Анатольевіча, у Польшчы да 1939 года гэтую неабходную на кожным вясковым падворку прыладу выраблялі 16 прадпрыемстваў. Каштавала сячкарня прыкладна 80 злотых, купіць яе мог толькі заможны селянін. Дарэчы, за карову тады давалі 65 злотых.

Другая «фішка» аграсядзібы «У Мароза» — свірны, якія гаспадар збірае ў навакольных вёсках і пераабсталёўвае пад гасцявыя домікі. Раней свіран для селяніна быў адной з самых важных пабудоў. Тут захоўвалі збожжа, муку, іншыя прыпасы. Каб пабудаваць добры свіран, бярвёны для зруба спачатку павінны былі сохнуць на працягу пяці гадоў. Апрацоўваліся яны ўручную. Якасць работ такая, што нават сёння ў сценах цяжка знайсці маленькую шчылінку.

І сапраўды, калі заходзіш у любы з чатырох гасцявых домікаў, адразу адчуваеш пах збожжа. А калі стукнуць па бярвёнах, яны гучаць моцна і чыста, быццам цымбалы.

Ёсць у калекцыі Уладзіміра Мароза і шматлікія прадметы сялянскага побыту мінулага і пазамінулага стагоддзяў. Госці аграсядзібы на свае вочы могуць убачыць саху, начоўкі розных памераў, ручную пілу, з дапамогай якой выраблялі дошкі, часалкі для воўны, стагадовыя вагі, драпач (культыватар) і іншае.

— Фізічнай працай любіў займацца з дзяцінства, — адзначае ён. — А яшчэ мне вельмі падабаецца беларуская прырода. Такіх прыгожых краявідаў, як у ваколіцах Талуёў, няма, здаецца, больш нідзе. Узгоркі, лес, возера... У 1986 годзе купіў у гэтай вёсцы дом, адрамантаваў яго. Паступова прыйшоў да думкі заняцца аграэкатурызмам. Жонка Галіна Фёдараўна ідэю падтрымала. Каб дагадзіць гасцям, зрабілі лазню, альтанку, валейбольную пляцоўку, выкапалі сажалку. Зборам экспанатаў для музея сячкарняў займаліся з задавальненнем.

Дарэчы, праехаць міма аграсядзібы «У Мароза» і не заўважыць яе проста немагчыма. Акурат насупраць падворка стаяць асвячоныя праваслаўны і каталіцкі крыжы. А каля іх з-пад зямлі б'юць дзве крыніцы з «жывой» і «мёртвай» вадой.

— Што цікава, адлегласць паміж крыніцамі ўсяго некалькі метраў, — зазначае Уладзімір Анатольевіч. — Але смак вады і яе ўласцівасці ў іх зусім розныя. Старажылы заўважылі, што «жывую» ваду лепш піць раніцай, каб увесь дзень быць бадзёрым і жыццярадасным. А вось «мёртвая» вада робіць сон спакойным і глыбокім.

На развітанне спадар Мароз дадаў, што дапамогу ў добраўпарадкаванні крыніц яму аказалі прадпрыемства «Маркава-Агра» і мясцовы сельсавет. У гаспадара аграсядзібы ёсць і іншыя задумы наконт таго, як зрабіць Талуі прывабнымі для гасцей і мясцовых жыхароў.

**Алег БЯГАНСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.051. Нумар падпісаны ў 19.30 16 верасня 2014 года.**

■ Не тармазі

# ХІТРА, МУДРА, АЛЕ ДОРАГА

## Чаму айчынныя аўтамабілі і аўтобусы пераходзяць на сціснуты газ?





Фота Андрэя ФІЛІПАВА.



**Прайшоў даўно той час, калі альтэрнатывы бензіну і дызельнаму паліву не было. Не хапала толькі тэхналогій для ўдасканалення новых мадэляў аўтатэхнікі. Цяпер усё ёсць — і выдатныя газавыя рухавікі, і бяспечныя кампазітныя балоны, і, самае галоўнае, попыт на газавую тэхніку. Працаваць ад попыту — выгадна. Гэта дае невялікія гарантыі збыту, у адрозненне ад сляпога выпуску новых мадэляў. Замест работы на склад, вытворца гатовы задаволіць рэальныя патрэбы рынку. Таму Мінскі аўтамабільны завод нядаўна прэзентаваў мадэлі бартавога аўтамабіля і двух аўтобусаў, якія працуюць на сціснутым газе. Мала таго, што гэта больш экалагічнае паліва, яно дае магчымасць высокай эканоміі. Для камунальных транспартных службаў гэта важна. І прыватнікі таксама не будуць супраць зніжэння выдаткаў. Адзіны недахоп — сама машына больш дарагая ў параўнанні з аналагамі. Аб перспектывах гэтага напрамку вытворчасці карэспандэнт «Звязды» гутарыў з Юрыем СЫРАКВАШАМ *(злева)*, галоўным канструктарам Мінскага аўтамабільнага завода па пасажырскай тэхніцы, і Паўлам ШАБАНАВЫМ, галоўным канструктарам МАЗа па аўтамабільнай тэхніцы.**

**«Звязда»: Чаму МАЗ заняўся вытворчасцю тэхнікі, якая працуе на сціснутым газе?**

**Ю. С.:** Тэма гэта не новая, яе вытокі ледзь не ў 1970-х гадах, калі многія аўтобусы (старыя ЛАЗікі і ПАЗікі) выкарыстоўвалі прыродны газ. Ёсць, зразумела, пэўная спецыфіка канструкцыі машыны. І сама тэма не атрымлівала развіцця па шэрагу прычын — адсутнасць заправачных станцый і спецыяльных рухавікоў. Акрамя таго, абслугоўваць, рамантаваць, нават кіраваць такім транспартам абавязаны спецыяльна падрыхтаваны персанал. І адсутнасць дэфіцыту вадкага паліва не вяла да стымулявання пераводу тэхнікі на газ. Аднак час ішоў, змянілася сітуацыя. Ёсць краіны, дзе мала нафты, але шмат газу. Напрыклад, Пакістан. І там вельмі шмат тэхнікі на газе. У той жа час на нашых традыцыйных рынках адбылося наступнае — нафта даражэе хутчэй за газ. А вялікі і магутны «Газпрам» сутыкнуўся з праблемай па рэалізацыі блакітнага паліва. Крызіс, падзенне вытворчасці. А газ пампуюць — трэба яго некуды аддаваць. І з'явілася пастанова Савета Міністраў Расійскай Федэрацыі аб субсідаванні набыцця тэхнікі, якая выкарыстоўвае сціснуты газ у якасці паліва. Іншымі словамі, расійскі ўрад бярэ на сябе абавязацельствы кампенсаваць розніцу паміж коштам газавай і традыцыйнай тэхнікі. Больш за тое, некаторыя рэгіёны ўжо абавязалі закупляць толькі тэхніку на газе (напрыклад, Татарстан, Самарскую вобласць, Краснадарскі край). І гэта адразу пераламала сітуацыю на рынку — з'явіўся попыт і фінансаванне. І мы памкнуліся ў гэтым кірунку. Восенню мінулага года зрабілі доследныя ўзоры, выпрабавалі, прэзентавалі. Цяпер чакаем тэндараў, цікавасць ужо ёсць. Многія рэгіёны закупляюць вопытныя ўзоры. Адзін з першых, дарэчы, пайшоў у Тальяці. Яны вельмі задаволены, добры расход паліва. Цяпер чакаем, калі ў кліента з'явяцца грошы. Ёсць попыт і ў Беларусі. У найбліжэйшы час вырашыцца пытанне з набыццём 40 газавых аўтобусаў для Мінска. Усё гэта паскорыць працэс — ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» будзе будаваць заправачныя станцыі ўжо пад нешта.

**«Звязда»: А хто сёння з'яўляецца канкурэнтам на гэтым рынку?**

**Ю. С.:** Перш за ўсё, Лікінскі аўтобусны завод і Нефцякамскі аўтазавод. Праўда там вельмі складаная лагістычная схема. Шасі вырабляюць на КамАЗе ў Набярэжных Чаўнах, потым яго перавозяць з Татарстана ў Башкірыю на НефАЗ. Там робяць кузаў. Потым ён зноў вяртаецца ў Набярэжныя Чаўны, дзе ўстанаўліваюць газавае абсталяванне. Мы ж робім усё на месцы.

**П. Ш.:** А КамАЗ выкарыстоўвае свой рухавік. Ён канструктыўна маральна састарэў. У нас кітайскі рухавік VH Power, спраектаваны пры ўдзеле еўрапейскіх кампаній. Сучасны і надзейны.

**Ю. С.:** На сваім аўтобусе мы сабралі ў камплектацыі ўсё самае лепшае. Газ пад ціскам у 200 атмасфер — гэта пэўная небяспека. Але ў свеце ўжо зроблена вельмі шмат для таго, каб мінімізаваць яе. Справакаваць праблемы можа толькі чалавечы фактар, тэхніка не павінна падвесці.

**«Звязда»: У многіх ёсць упэўненасць у тым, што тэхніка на газе ў прынцыпе небяспечная...**

**Ю. С.:** Згодны, што работа пад высокім ціскам заўсёды небяспечная, аднак мы прымянілі не звычайныя стальныя балоны, а кампазітныя, так званыя «чацвёртага пакалення». Яны вытрымліваюць пры выпрабаваннях ціск у 600 атмасфер — у тры разы больш. Нават калі кампазітны балон выбухне, то ён не разляціцца на асколкі, як стальны, а проста раскрыецца. Калі адбываецца пажар, то існуе некалькі клапанаў, якія пачынаюць страўліваць газ пры павышэнні тэмпературы.

**«Звязда»: Што яшчэ ёсць прынцыпова новае, чаго не выкарыстоўвалі ў аналагах?**

**Ю. С.:** Рухавік, які мы паставілі, пераўзышоў усе чаканні. Кампанія Mersedes стварыла спецыяльны газавы рухавік, а мы, дарэчы, па аўтобусах з'яўляемся эксклюзіўнымі спажыўцамі гэтай прадукцыі. На тэрыторыі СНД яны больш нікому іх не прадаюць. Зыходзячы з першых выпрабаванняў, расход газу быў вельмі добры. Калі тое самае пацвердзіцца пры розных умовах эксплуатацыі, то мы будзем вельмі задаволены вынікамі. Расход паліва ніжэйшы на 60%.

**П. Ш.:** Мы вырашылі зрабіць універсальнае шасі для рознай камунальнай тэхнікі. Машыну можна выкарыстоўваць і як развазны фургон, і як іншую тэхніку, у залежнасці ад надбудовак. Пакуль у нас аптымістычны прагноз. Да пачатку зімы плануем скончыць усе сертыфікацыйныя выпрабаванні, каб прадаваць аўтамабіль як у Беларусі, так за мяжой.

**«Звязда»: Ці прагназавалі вы попыт на гэтыя мадэлі?**

**Ю. С.:** Фінансаванне куплі аўтобусаў часцей за ўсё муніцыпальнае ці бюджэтнае, таму цяжка прагназаваць. Аднак калі будзе попыт, то мы заўсёды зможам задаволіць яго, бо на склад мы не працуем. Асноўным рынкам пры гэтым прагназуем Расію. Ёсць пэўны інтарэс у Казахстане. Можа быць, зацікавіцца Польшча.

**П. Ш.:** У нас муніцыпальнае фінансаванне — не галоўнае. Мы шмат прадаём сваіх машын прыватнікам. Хоць штуршком і для нас было тое, што расійскі ўрад паабяцаў падтрымку. Наш урад таксама хутка пойдзе па гэтым шляху, бо сама аўтатэхніка атрымліваецца даражэйшай, але расход паліва больш эканомны. Мы чакаем, як пойдзе аўтобусны напрамак, і будзем тады самі рухацца далей.

**«Звязда»: Чаму Еўропа не хоча купляць тэхніку на газе?**

**Ю. С.:** Сама па сабе гэтая тэхніка даражэйшая. Прыкладна на трацiну. Акрамя таго, там таксама не хапае заправак. Усё залежыць ад палітыкі дзяржавы.



Фота Дзмітрыя ГЛАДКАГА.

**«Звязда»: У цэлым перспектыву развіцця менавіта гэтай галіны як вы ацэньваеце?**

**Ю. С.:** Кан'юнктуру прадказаць вельмі цяжка. Яна залежыць ад многіх фактараў. Хто мог спрагназаваць падзеі ва Украіне? «Газпраму» цяпер вельмі цяжка накіроўваць газ у Еўропу. Калі ён будзе заставацца ў Расіі, то будзе таннець — тады для нас з'явяцца вельмі спрыяльныя ўмовы. Калі пабудуюць «Паўднёвую плынь», то газ падаражэе.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Чым багаты...

# ЖЫВЫ ПРЫБЫТАК,

## або Асаблівасці вытворчасці беларускіх далікатэсаў



**Беларусь — краіна з унікальнай экасістэмай. Гэта адкрывае прадпрымальным людзям шырокія магчымасці. Так, у нас цалкам звыклай справай стала з'яўленне страусавых фермаў. Пры добрых інвестыцыях і дастатковай працавітасці гэта бізнес з вялікай акупнасцю. І справа не толькі ў тым, што страусы — гэта крыніца нізкакаларыйнага пажыўнага мяса і тлушчу, з якога можна вырабіць амаладжальны крэм. Такія фермы ператвараюцца ў куткі экатурызму, якія прываблiваюць сотні ахвотнікаў паглядзець на некалі экзатычную для нашых краёў птушку.**

У той жа час натуральнай з'явай для Беларусі з'яўляюцца смаўжы. Іх можна сустрэць паўсюль. Але мала хто задумваецца, якую каштоўнасць яны ўяўляюць. У Еўропе гэта дарагі далікатэс. Прычым правільна прыгатаваны смоўж, акрамя таго, што з'яўляецца пажыўным, мае шмат карысных уласцівасцяў...

### ПАЧЫМ СТРАУСЫ?

Развядзенне гэтых птушак вельмі перспектыўнае з пункту гледжання колькасці камерцыйнага прадукту ў іх жывой вазе. Нашы кліматычныя ўмовы птушцы цалкам падыходзяць. Жыве страус да 70 гадоў і прыкладна палову свайго жыцця самкі здольныя несціся. Вага аднаго яйка ад 1,5 кг, а за сезон іх можа быць да 60 штук. Птушаняты вылупліваюцца праз 42 дні. За сезон іх можа быць да 40. За год птушаня здольна набраць 100 кг жывой вагі. Агульная вага пагалоўя ад адной пары страусаў складзе прыблізна 4 т, а гэта ад 1500 да 1800 кг чыстага мяса. Гэта на парадак вышэй за тое, што за год можа даць карова. У свеце, які аддае перавагу здаровай ежы, карыснае страусавае мяса адпавядае ўсім патрабаванням дыетолагаў. Тлушчаў і халестэрыну ў ім змяшчаецца амаль у два разы менш, чым у ялавічыне, кураціне ці свініне. Чырвонае мяса страуса лічыцца самым посным і адрозніваецца высокай колькасцю бялку, найбагацейшым наборам мікраэлементаў, такіх як марганец, фосфар і калій. Страусавае мяса рэкамендуюць людзям з павышаным артэрыяльным ціскам, сардэчнай недастатковасцю, цукровым дыябетам, анеміяй, у пасляаперацыйны перыяд. У страусавым філе — каля 1,2% тлушчу, аднак прыгатаваныя з яго стравы вельмі далікатныя на смак.

Кошт аднаго харчовага яйка — ад 160 тысяч беларускіх рублёў. Страусавы фарш каштуе каля 90 тыс. за кг, філе страуса — да 250 тыс. Ну а калі вы надумаеце разводзіць гэтую птушку, то жывы афрыканскі страус узростам 1 год абыдзецца прыблізна ў 1200 долараў.

### АСАБЛІВАСЦІ НАШАЙ СТРАУСАГАДОЎЛІ

У Беларусі страусагадоўляй займаюцца ў асноўным прыватныя прадпрыемствы. Такія фермы ёсць у Камянецкім раёне, побач з Кобрынам і ў Слуцкім раёне. Лагічна было падумаць, што страусавае мяса магчыма пастаўляць у Расію ў сувязі з эмбарга на ўвоз прадукцыі з ЕС, аднак высветлілася, што мясцовыя фермы яшчэ не здольны працаваць на такіх вытворчых магутнасцях. А ў Расіі, разумеючы ўсю выгаду ўкладанняў у страуса, прадпрымальнікі пабудавалі нямала сваіх страусіных гаспадарак. Цяпер гэты бізнес у Беларусі здольны акупіць сябе, а вось выйсці на новы ўзровень перашкаджае велізарная колькасць патрэбных сертыфікатаў і адсутнасць плошчаў для павелічэння пагалоўя. Так, напрыклад, на страусінай ферме «Страуслэнд», што ў Камянецкім раёне, на працягу трох гадоў не могуць дамовіцца аб набыцці новай плошчы для таго, каб павялічыць колькасць птушак. Як растлумачылі прадстаўнікі страусавага ранча, праблема з экспартам у Расію вырашаецца. Для гэтага неабходна сертыфікаваць ферму. А для таго, каб паставіць мяса ў ЕС, неабходна, каб прадукцыя адпавядала ўсёй жорсткасці стандартаў, якія там устаноўлены. Хоць адзначаюць, што прадпрымальнікі з Расіі прыязджаюць, каб купіць маладых асобін. Для гэтага дастаткова ветэрынарных даведак пра здароўе птушкі. Ды і ў Літве ўжо не першы год цікавяцца беларускімі страусамі. Адназначна ёсць куды расці. Але пакуль магчыма афарміць пастаўкі толькі на ўнутраны рынак. З прычыны росту папулярнасці мяса страуса вялікую цікавасць да яго праяўляюць гандлёвыя сеткі. Але ў вырабе страусавага мяса ёсць свая складанасць. Беларускія мясакамбінаты не прадугледжваюць забой страуса. Адпаведна няма і спецыяльнага абсталявання. А ўявіце, што будзе, калі такі страус вырвецца на волю на прадпрыемстве? Птушку, якая бегае з хуткасцю 60 км у гадзіну і важыць больш за 100 кг, спыніць вельмі цяжка. Вось і прыходзіцца прадпрымальнікам усё рабіць самім.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Яшчэ адзін напрамак — гэта экатурызм. Бо на ферме можна ўбачыць страуса ў натуральных умовах у адрозненне ад заапарка. На страусінай ферме, размешчанай у 20 км ад Кобрына, на працягу 40-хвіліннай экскурсіі можна ўбачыць увесь жыццёвы цыкл птушкі і даведацца пра асаблівасці яе пражывання на ферме. Таксама можна пакаштаваць страусавае мяса на смак і набыць тавары з яго скуры.

Што да дзяржаўных прадпрыемстваў, то яшчэ страусагадоўляй займаецца агракамбінат «Прыдняпроўскі», які знаходзіцца пад Магілёвам. Параўнальна нядаўна там адкрылася страусавае ранча. Як патлумачылі на прадпрыемстве, ферма ў асноўным працуе на ўнутраны рынак. За апошні год паказчыкі паставак павялічыліся ў некалькі разоў.

**А ці сапраўды жадаюць нашы грамадзяне пакаштаваць мяса смаўжоў і страусаў?**

**Аляксандр Іванавіч, 80 гадоў, пенсіянер:**

«У маладосці каштаваў мяса страуса. З тых часоў даўно не еў. На смак яно як кураціна. Цяпер бы не адмовіўся. Але не ведаю, дзе яго ў нас вырабляюць. А вось смаўжоў не рызыкнуў бы есці».

**Алена, галоўны бухгалтар:**

«Страусавае мяса цікава паспрабаваць. І смаўжоў таксама, калі б іх правільна прыгатавалі. Кажуць, што гэта вельмі смачна».

**Яўген, 20 гадоў, студэнт:**

«Не еў мяса страуса, але, думаю, паспрабаваць можна. Смоўж, як мне здаецца, на смак будзе падобны да мідыі. Мідыі мне падабаюцца. Паспытаў бы і смаўжа, а чаму б і не?»

### ЕЎРА ПАД КАМЕНЕМ

Паводле ацэнак навукоўцаў, біялагічныя запасы вінаграднага смаўжа ў Беларусі сёння ацэньваюцца ў 800-1000 тон. Пры гэтым у Францыі, Іспаніі ці Італіі смаўжы разыходзяцца ў рэстаранах па 30-60 тысяч тон за год. У спісы лідараў па гадоўлі смаўжоў Беларусь, магчыма, не ўваходзіць таму, што ў нас ніхто мэтанакіравана іх не гадуе. Нягледзячы на тое, што мяса смаўжоў пажыўнае, лёгка пераtраўліваецца, змяшчае шмат кальцыю, без халестэрыну.

Збор смаўжоў — даволі прыбытковая справа. Займаюцца ім позняй вясной, калі з'яўляецца дастатковая колькасць свежай зеляніны. Гэта дазваляе смаўжу палепшыць свае харчовыя якасці і прачысціць страўнік пасля зімовай спячкі. Па інфармацыі акадэмічных навукоўцаў, у Гродзенскай вобласці малюскі жывуць на тэрыторыі плошчай ад сотняў да некалькіх тысяч гектараў. Шмат іх ва ўрочышчы Замкавы лес каля Ваўкавыска, ва ўрочышчы Медухава ў Зэльвенскім раёне. Менавіта на Гродзеншчыне знаходзіцца прадпрыемства, якое займаецца вінаграднымі смаўжамі — фірма «Мока». Яна мае на тэрыторыі нашай краіны нарыхтоўчыя пункты. Там малюскаў перапрацоўваюць і экспартуюць у Еўропу ў выглядзе паўфабрыкатаў. Прадстаўнікі фірмы сёлета не адзначаюць узрастання экспарту вінаградных смаўжоў у Расію. У Еўропу ж прадукцыю ўжо адгрузілі. Па аб'ёмах паставак на прадпрыемстве адмовіліся даваць якія-небудзь каментарыі. Але калі меркаваць па паказчыках Белстата, то за паўгоддзе смаўжоў з Беларусі пастаўлена 120 тон, на агульную суму 216,9 тыс. долараў. Асноўнымі спажыўцамі беларускіх смаўжоў з'яўляюцца Венгрыя, Румынія і Чэхія. Дарэчы, менавіта на Чэхію сёлета прыпала палова экспарту.

Далікатэс, дарэчы, можна пакаштаваць і ў рэстаранах Мінска. У сталіцы ёсць некалькі ўстаноў, якія пададуць вам малюска, прыгатаванага ў лепшых французскіх традыцыях. Ды і ў Расіі цяпер шмат рэстаранаў, якія спецыялізуюцца на далікатэсах. Ёсць верагоднасць, што ў сувязі з забаронай на ўвоз многіх прадуктаў з ЕС у Расію, магчыма, павысіцца попыт на вінаградных смаўжоў. А гэта дадатковы сектар, адкуль Беларусь можа атрымаць прыбытак.

У нас ёсць усе магчымасці для заробку грошай на далікатэсах. Ёсць і людзі, якія гэтым займаюцца. Аднак гэты бізнес яшчэ знаходзіцца на ўзроўні магчымых перспектыў і патрабуе інвестыцый.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■


**ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Триумфстрой»,**

**опубликованной в газете «Звязда» №173 (27783) от 12.09.2014, по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П.Глебки» (без инженерных сетей)**

ООО «Триумфстрой» информирует о внесении изменений (в связи с допущенной технической ошибкой) в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» № 173 (27783) от 12.09.2014, по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П.Глебки» (без инженерных сетей):

**Внести следующие изменения:**

**Абзац** «Стоимость одного квадратного метра общей площади жилого помещения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 12 564 000 рублей, что эквивалентно 1200 долларам США по курсу НБ РБ по состоянию на 10.09.2014 г. Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра жилого помещения в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора. Оплата цены объекта долевого строительства (квартиры) производится в размере 100% в течение двух банковских дней.»

**читать в следующей редакции:**

«Стоимость одного квадратного метра общей площади жилого помещения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 23 034 000 рублей, что эквивалентно 2200 долларам США по курсу НБ РБ по состоянию на 10.09.2014 г. Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра жилого помещения в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора. Оплата цены объекта долевого строительства (квартиры) производится в размере 100% в течение двух банковских дней.» УНП 190465926

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Доля 29/100 капитального строения, инв. № 451/С-687 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ), площадью 936,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Шоссейная, 10. (Склад для хранения оборудования.)<br>- Капитальное строение, инв. № 451/С-13091 (назначение – здание многофункциональное), площадью 87,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская. Составные части и принадлежности: две холодные пристройки, три ограждения, ворота. (Сберкасса – лаборатория.)<br>- Капитальное строение, инв. № 451/С-13090 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства), площадью 43,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская. Составные части и принадлежности: пожарный пост, резервуар. (Пожарный пост с резервуаром.)<br>- Капитальное строение, инв. № 451/С-13092 (здание специализированное коммунального хозяйства), площадью 7,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская. Составные части и принадлежности: навес. (Кочегарка для сберкассы.)<br>- Капитальное строение, инв. № 451/С-13093 (здание административно-хозяйственное), площадью 9,0 кв.м., расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская. (Проходная.)<br>- Капитальное строение, инв. № 451/С-13875 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – норийная вышка), площадью 76,5 кв.м., расположенное по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Шоссейная, 10/4. |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422356300002000089 общей площадью 2,1395 га (назначение – для эксплуатации и обслуживания хлебоприемного пункта) по адресу: Гродненская область, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Шоссейная, 10 |
| **Начальная цена продажи** | 332 070 420 (триста тридцать два миллиона семьдесят тысяч четыреста двадцать) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 16 603 521 (шестнадцать миллионов шестьсот три тысячи пятьсот двадцать один) белорусский рубль |
| **Продавец** | ОАО «Новоельнянский комбинат хлебопродуктов», 231470, Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская, 37, 22-360, 43-154 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 20 октября 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 14 октября 2014 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Уважаемые акционеры ОАО «Молодечнолес»**

**30 сентября 2014 года по адресу: г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Молодечнолес».**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О ликвидации ОАО «Молодечнолес».
2. О создании ликвидационной комиссии.
3. Об установлении порядка и срока ликвидации.

Начало работы собрания — 30 сентября 2014 года в 12.00.

Регистрация участников с 10.00 до 11.30 по предъявлению документа, подтверждающего личность. УНП 600066488

**Считать недействительными** страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0648081, 0648082, 0648083, 0648084, 0648085 в связи с утерей.

В **суд Молодечненского района Минской области** поступило заявление об объявлении умершим МИКУЛЬСКОГО Юрия Юрьевича, 22.01.1985 года рождения, уроженца д. Ганцевичи Брестской области, зарегистрированного в Минской области, Молодечненском районе, д. Дуброво, ул. Дыбовского, 72. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить суду в течение 2 месяцев с момента публикации объявления по адресу: г. Молодечно, ул. Партизанская, 5, или по тел. 777684, 771504.

# Валянціна ГАЯВАЯ:

# «ПАЛЁТ НАД ЧАСАМ»

## Мастацкі кіраўнік «Харошак» — пра лёс, творчасць і планы

**ГЭТЫ калектыў не зблытаеш ні з якім іншым. Дзякуючы свайму непаўторнаму стылю, багатай фантазіі і арыгінальнасці задум, неверагодна высокаму выканальніцкаму майстэрству, «Харошкі» займаюць у сучасным беларускім мастацтве асаблівае, незаменнае месца. За амаль сорак гадоў сваёй сцэнічнай дзейнасці «Харошкі» сталі з'яваю, своеасаблівым брэндам Беларусі. Аб гэтым сведчаць не толькі шматлікія дыпломы і Гран-пры, атрыманыя на самых прэстыжных фестывалях і конкурсах, але і бліскучыя выступленні на лепшых сусветных сцэнах — маскоўскай канцэртнай зале «Расія», лос-анджэлескім «Сітызен-Холе», шматтысячнай спартыўна-канцэртнай зале ў Іарданіі... Варта пры гэтым адзначыць: ансамбль «Харошкі» — калектыў аўтарскі. Яго стваральнік і нязменны кіраўнік — Валянціна ГАЯВАЯ. Народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне», кавалер ордэнаў Францыска Скарыны і Дружбы народаў. Найталеневіцейшы харэограф з выразным і непаўторным «почыркам». Выдатны педагог, чыімі стараннямі выхавана не адно пакаленне артыстаў.**

У творчым лёсе Валянціны Іванаўны шмат парадаксальнага. Ураджэнка Расіі, яна ўсё сваё свядомае жыццё прысвяціла мастацтву Беларусі. У юнацтве марыла стаць актрысай, а стала балетмайстрам, харэографам. Стварыла выдатны харэаграфічны ансамбль, якім захапляліся гледачы ў дзясятках замежных краін, а дома яго як бы і не заўважалі. Больш за тое, пагражалі закрыць. Яна ўкладала ў свае праграмы бязмежнае пачуццё любові да беларускай культуры, беларускай гісторыі, а яе абвінавачвалі ў нацыяналізме, апяванні шляхты, узвялічванні магнатаў. Яна глыбей за многіх беларусаў адчула і раскрыла вялізны патэнцыял нацыянальнай народнай спадчыны, сваёй творчасцю ўзбагаціла духоўную скарбніцу беларускага народа, а яе абвінавачвалі ў тым, што яна разбурае фальклор, заводзіць айчынную харэаграфію ў тупік. Папракалі нават за тое, што яна займаецца самарэкламай, праяўляе нясціпласць, назваўшы ансамбль прыгожым імем «Харошкі» (маўляў, сама сабе дае атэстацыю — якія яны харошыя). А на самой справе назва пайшла ад вёскі Харошкі, што на Магілёўшчыне, дзе быў запісаны адзін з першых нумароў ансамбля — «Гусарыкі», які, дарэчы, да гэтага часу захоўваецца ў рэпертуары...

Прызнаюся: усю гэту інфармацыю я вычытаў — што ў друкаваных СМІ, а што ў інтэрнэце. Аднак цікавасць мая да «Харошак» і іх мастацкага кіраўніка не толькі не зменшылася, а наадварот, узрасла. З'явілася шмат пытанняў, на якія хацелася атрымаць адказы. І я напрасіўся да Валянціны Гаявой на сустрэчу.

### Ад лёсу не ўцячэш

***— Дасведчаныя людзі кажуць: каб лепш зразумець творчага чалавека, трэба пабываць у яго на радзіме. У мяне цяпер такой магчымасці, на вялікі жаль, няма. Але мы можам разам з вамі, Валянціна Іванаўна, зрабіць неабходнае падарожжа ва ўспамінах. Раскажыце, калі ласка, крыху пра сваю малую радзіму, пра сваё дзяцінства.***

— Вой, хіба сапраўды крыху, бо пра гэта можна расказваць бясконца. І што самае цікавае: з гадамі гэтыя ўспаміны ўсё больш яркія, цёплыя, хвалюючыя...

А нарадзілася я ў Валгаградскай вобласці, у мястэчку Данілаўка. Па тым часе гэта быў даволі вялікі населены пункт, які размяшчаўся на беразе маляўнічай рэчкі Мядзведзіца. Побач з вёскай — заліўны луг, ці, як кажуць у Беларусі, поплаў, на якім, уздоўж рэчкі — вербы, вербы, вербы... Крыху воддаль — рукатворнае возера, на беразе якога стаяў панскі дом. І ўвесь луг усыпаны крокусамі, што зацвіталі ў маі і цвілі амаль цэлы месяц. А ў чэрвені ўжо ўсё выгарала ад бязлітаснага сонца. Зімой у нас заўсёды было пад сорак градусаў марозу, а летам стаяла спёка. Яшчэ бывалі сухавеі, якія нібы агнём абпальвалі рукі, твар.

У нас быў калодзеж такой глыбіні, што страшна было ў яго глядзець. Мне нават неаднойчы снілася, што я туды падаю, і прачыналася ад уласнага крыку. Вось з гэтага калодзежа нам з сястрой даводзілася штодня насіць ваду вёдрамі.

Але цяпер усё гэта прыгадваецца з цеплынёй і замілаваннем. Больш за тое, я нават думаю, што няпростыя абставіны мелі і свой станоўчы бок: яны фарміравалі характар тамтэйшых жыхароў. Каб нешта мець, трэба было праяўляць цярплівасць, упартасць, настойлівасць. Нешта ад гэтага, напэўна, перадалося і мне.

***— А хто былі вашыя бацькі?***

— Бацька працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады. Ад МТС, машынна-трактарнай станцыі. Абслугоўваў, як зараз помню, калгас імя Молатава. У яго брыгадзе было два трактары ЧТЗ і некалькі СТЗ — гэта трактар з такімі вялікімі жалезнымі коламі з шыпамі. І яшчэ мелася два ці тры збожжаўборачныя камбайны.

***— Адкуль вы ўсё гэта ведаеце?***

— Дык я ж, пачынаючы з канца вясны і пакуль ісці ў школу, жыла ў гэтым атрадзе, на палявым стане. І мая малодшая сястра Ніна таксама. Дый маці на лета перабіралася сюды. Яна была паварыхай у атрадзе.

Ведаеце, гэтыя летнія месяцы былі для мяне самыя радасныя, самыя жаданыя. Як толькі прыходзіла вясна, мяне ўжо цягнула туды, у стэп. Які ж ён прыгожы ў гэтую пару! Суцэльны зялёны дыван з мноствам цюльпанаў ці, як мы іх называлі, гарыцветаў, безліччу дзікіх півоняў, крокусаў. Хараство незвычайнае!

А побач з палявым станам быў байрак — гэта нешта падобнае на роў, толькі шырэйшы, глыбейшы. І ў ім раслі дрэвы, кусты. Нідзе больш дрэў, на дзясяткі вёрст, не было, а тут — сапраўдная зялёная раскоша. Мы з сястрою любілі ў гэтым байраку ладзіць розныя гульні. А то і проста паляжаць у цяньку, палюбавацца аблокамі, памарыць.

***— Вось, аказваецца, адкуль вашае рамантычнае, паэтычнае светаўспрыманне... Ці не тады і нарадзілася мара стаць артысткай, прысвяціць жыццё творчасці?***

— Магчыма, нешта перадалося і ад навакольнай прыроды. Але, думаю, галоўную ролю сыгралі гены. Мой дзед Цімоха меў незвычайны талент апавядальніка. Ён быў удзельнікам дзвюх войнаў — руска-японскай і грамадзянскай. Але звычайна расказваў розныя забаўныя гісторыі і смешныя байкі. То пра тое, як з Будзённым з аднаго глечыка малако піў. То як генералу карову купляў і як вучыў генеральшу гэтую карову даіць... Калі ён садзіўся і пачынаў свае аповеды, то ад смеху клаліся і старыя, і малыя. Сапраўдны шолахаўскі дзед Шчукар!



Фота БЕЛТА.

***— І рана дзедавы гены прачнуліся?***

— Рана. Самае цікавае, што ў дзяцінстве я была, у адрозненне ад сваёй бойкай, камунікабельнай сястры, сарамлівая, замкнутая. Таму ўсе дужа здзівіліся, калі ў першым класе мы з маёй сяброўкай, таксама Валяй, зрабілі інсцэніроўку аднаго смешнага апавядання — паказалі са сцэны дыялог фанабэрыстага пана і глухаватага, але вельмі дасціпнага дзеда. Я, вядома, іграла дзеда. І, відаць, удала, таму што ў зале заходзіліся ад рогату. А ў піянерважатай, якая і натхніла нас на гэты скетч, ажно цяклі слёзы.

А потым у старэйшых класах я ўжо займалася ў драматычным гуртку і шмат удзельнічала ў розных міні-спектаклях. Акрамя гэтага, я займалася яшчэ ў літаратурным гуртку. Вельмі многа чытала. Асабліва драматычных твораў. Праштудзіравала ўсяго Шэкспіра, Астроўскага, Лопэ дэ Вега...

***— Ужо свядома рыхтаваліся да акцёрскай прафесіі?***

— Рыхтавалася. Пасля школы паехала ў Маскву, трапіла на прагляд у Малы тэатр. Але ў мяне напярэдадні, як на тое зло, забалеў зуб. І вось у такім стане я і выступала перад камісіяй. І, як мне здалося, выступіла няблага. Аднак мне сказалі: «Вы цікавы экзэмпляр. Толькі ў вас загана моўнага апарату...» А я пасаромелася сказаць пра сваю бяду. Так з майго паступлення ў тэатр нічога і не атрымалася.

Аднак ад свайго лёсу не ўцячэш. Калі табе нешта наканавана ў гэтым жыцці, то яно абавязкова збудзецца. Так атрымалася і ў мяне. Пасля заканчэння культасветшколы я некалькі гадоў працавала кіраўніком калектываў мастацкай самадзейнасці. Паступіла ў Вышэйшую школу прафсаюзнага руху ВЦСПС, атрымала спецыяльнасць харэографа...

Вось бачыце, якія павароты лёсу. І хоць я з дзяцінства любіла танцаваць, але ніколі не думала, што буду харэографам. Гэта выпадковасць. Але выпадковасць шчаслівая.

***— Якім чынам вы апынуліся ў Беларусі, на Магілёўшчыне?***

— Тут амаль дэтэктыўная гісторыя. А калі коратка, то было так. На размеркаванні, хоць я і атрымала чырвоны дыплом, мне сказалі, што я павінна вярнуцца туды, дзе давалі накіраванне. Аднак новы дырэктар Дома культуры перапужаўся, што я магу заняць ягонае крэсла, і пачаў круціць носам. Я зразумела, што мне там рабіць няма чаго. Узяла адмацаванне і паехала на радзіму. Да бацькоў. Тым больш што надышла пара нараджаць. Я ж на апошнім курсе выскачыла замуж, але мужа неўзабаве забралі ў армію, і мне давялося ехаць да бацькоў адной. Там я шчасліва нарадзіла сына, Алёшаньку. А праз колькі месяцаў пайшла працаваць у школу, выкладала ў старэйшых класах нямецкую мову.

Ды мне ўсё ж быў наканаваны іншы шлях. Недзе праз год я амаль адначасова атрымала адразу два запрашэнні прыязджаць на працу па спецыяльнасці: ад дырэктара таго завода, дзе мы стварылі ансамбль песні і танца, і ад маёй аднакурсніцы Тамары Сласцёнавай, якая ў Магілёве ўжо працавала начальнікам абласнога ўпраўлення прафсаюзаў. І я, разважыўшы, вырашыла ехаць у Магілёў — там харэаграфічны калектыў застаўся без мастацкага кіраўніка. Спачатку пры Доме культуры Магілёўскага аўтазавода разам з мужам стварылі харэаграфічны ансамбль «Вяснянка», а пасля арганізавалі яшчэ дзіцячую студыю, каб рыхтаваць кадры для дарослага калектыву. І праз тры гады наша «Вяснянка» была ўжо ў поўным сэнсе прафесіянальнай.

Аднойчы па ініцыятыве Міністэрства культуры і нашага опернага тэатра вырашана было правесці рэспубліканскі конкурс на лепшы беларускі народны танец. А я ўжо да таго часу зрабіла «Перапляс дзвюх вёсак». Нумар, праўда, быў крыху прасцейшы, чым цяпер, але ўсё роўна гледачы прымалі яго з вялікім захапленнем. Гэта быў своеасаблівы міні-спектакль. Дзве вёскі сабраліся на свята. У кожнай свае ўборы, свая манера танцаваць. Хто ж пераможа ў танцавальным спаборніцтве?

Мы вырашылі гэты нумар паказаць на конкурсе. І не памыліліся: наш «Перапляс» заваяваў самую высокую ацэнку журы, а я як балетмайстар за гэты танец атрымала Гран-пры!

А неўзабаве пасля гэтага да нас у Магілёў прыехала цэлая дэлегацыя ад Міністэрства культуры і філармоніі. Папрасілі паказаць усю праграму. Паглядзелі, шматзначна пераглянуліся і паехалі. А праз колькі дзён запрашаюць нас у міністэрства на гутарку і прапаноўваюць узначаліць Дзяржаўны ансамбль танца, які на той час застаўся без кіраўніка. А я ведала, што ў гэтым калектыве вельмі складаная атмасфера. Людзі там не прывыклі сур'ёзна працаваць, і калі мы пачнём нешта патрабаваць — ім гэта не спадабаецца. Некаторыя з іх пабягуць у міністэрства, маючы там пэўную падтрымку і пратэкцыю. І мы адмовіліся.

### Нараджэнне легенды

***— І з чаго вы пачыналі?***

— Пэўны час працавала з вакальна-інструментальным ансамблем «Верасы», дапамагала зрабіць ім новую праграму. Пасля Валодзя Мулявін запрасіў разам стварыць рок-оперу «Песня пра долю». Але, вядома, галоўная мая задача заключалася ў тым, каб стварыць нацыянальны ў поўным сэнсе гэтага слова харэаграфічны калектыў. Беларусь была ў Саюзе трэцяй па значэнні рэспублікай, а адпаведнага калектыву не мела. Калі трэба было ехаць на нейкія зводныя канцэрты ў Маскву, то везлі галоўным чынам «Юрачку» ды «Бульбу». Ну яшчэ хіба «Лявоніху». Але і яны не былі арыгінальнымі танцамі, а скапіраванымі з пастановак Ігара Маісеева, з украінскага гапака. Словам, багатая народная культура зводзілася да сярэдненькай полечкі.

Мне ж хацелася паказаць гледачу аўтэнтычныя беларускія танцы, якія істотна адрозніваюцца ад рускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх. Стварыць сапраўды нацыянальны, самабытны калектыў, які б мог спаборнічаць у майстэрстве з такімі гігантамі, як славуты ансамбль Ігара Маісеева, Грузінскі нацыянальны балет імя Іліко Сухішвілі і Ніно Рамішвілі, ансамбль танца імя Вірскага з Украіны.

Падказку я вырашыла шукаць, заглыбіўшыся ў багатыя пласты нацыянальнай гісторыі. На той час гэта была абсалютна не распрацаваная ў нашай культуры ніша. Мне казалі: «Якая культура? Якая гісторыя? Беларусь увесь час была то пад Польшчай, то пад Расіяй». А я не магла нават сабе ўявіць, каб такая краіна не мела сваёй «еўрапейскай» гісторыі, адлюстраванай у культуры. І мая інтуіцыя мяне не падвяла. З самага пачатку я імкнулася да таго, каб кожны танец быў самастойным, каб артысты не проста бегалі па сцэне ды весяліліся, а каб неслі нейкую ідэю, прымушалі гледача над чымсьці задумацца.

А неўзабаве прыйшоў і першы вялікі поспех. У 1977 годзе на Усесаюзным конкурсе прафесіянальных калектываў, прысвечаным 60-годдзю Кастрычніка, «Харошкі» сталі лаўрэатамі і атрымалі дыплом першай ступені. Гэта была ў нейкім сэнсе сенсацыя. Таму што да гэтага беларусы, у адрозненне ад украінцаў і грузін, нічым асаблівым не вызначаліся на маскоўскіх сцэнах.

***— У чым жа сакрэт вашага пастаяннага поспеху?***

— Сваю папулярнасць мы заваявалі тым, што ад самага пачатку былі не падобны да іншых. Мы паставілі сабе задачу-максімум: кожны нумар рабіць арыгінальным, непаўторным. На аснове народна-сцэнічнага танца ствараем міні-балеты, у якіх ёсць змест. Абавязкова. Ёсць сюжэт — экспазіцыя, развіццё тэмы і кульмінацыя, фінал. Бывае фальш-фінал, ён пасля паўторыцца па-іншаму.

Вельмі важна правільна пабудаваць праграму, каб у гледача з кожным наступным танцам нарасталі станоўчыя эмоцыі, каб ён не толькі разумеў, што адбываецца на сцэне, але і жыў гэтым, радаваўся, захапляўся, перажываў. На сцэне ў нас выступаюць не проста танцоры, а пэўныя персанажы. Каб стварыць яркі, каларытны вобраз такога персанажу, патрабуецца немалое акцёрскае майстэрства.

### Кадры для кадрылі

***— І дзе ж вы такія кадры знаходзіце, каб яны выдатна танцавалі ды яшчэ валодалі акцёрскім талентам?***

— Свае кадры мы рыхтуем самі. Напачатку было вельмі складана. На паперы ансамбль існаваў, а рэальных людзей не было. Хто ж нам аддасць падрыхтаваных танцораў? Давялося набіраць хлопцаў і дзяўчат з харэаграфічнага вучылішча — слабенькіх, тых, каго пры размеркаванні ніхто не ўзяў. Праўда, некалькі чалавек перайшло да нас з народнага хору. Сяго-таго ўдалося пераманіць з «Вяснянкі», былога нашага магілёўскага гурта... Артысты рэпетавалі да знямогі, а сама я пастаянна апантана шукала што-небудзь арыгінальнае, самабытнае. Чытала спецыяльную літаратуру, некласічныя народныя па падглядвала на вяселлях у глыбінцы, на местачковых святах, на зводных канцэртах мастацкай самадзейнасці. Аднойчы, памятаю, на адным з такіх канцэртаў-аглядаў я была ў складзе журы. У перапынку ўсе пайшлі абедаць, а я засталася. З цікаўнасці зазірнула за кулісы. Гляджу — а там жанчыны з Магілёўшчыны сабраліся ў гурт, селі на падлозе, дасталі сала, агуркі, хлеб. Выпілі па кроплі, закусілі і ціхенька заспявалі. А адна немаладога ўжо веку жанчына пайшла танцаваць. І колькі ж у яе імправізаваных, нестандартных рухах было натуральнай грацыі, пластыкі, хараства! Пасля мы стварылі сваю школу-студыю і некалькі гадоў праблемы з кадрамі практычна не існавала. Але трэба ж было нейкай «разумнай» галаве ўстанавіць за гэтае памяшканне такую арэнду, што мы вымушаны былі аддаць школу гарадскому ўпраўленню культуры — з усімі педагогамі, касцюмернай, бібліятэкай. На жаль, новы ўладальнік не палічыўся з нашымі інтарэсамі і перарабіў усё на свой лад і густ. Педагогаў маіх звольнілі, заняткі класічнымі танцамі скарацілі і такім чынам унікальную школу знішчылі. Мы паспрабавалі былі вярнуць памяшканне назад, але нічога не атрымалася.

***— І як жа вы выходзіце са становішча?***

— Па-рознаму. Некага знаходзім сярод выпускнікоў харэаграфічнага вучылішча і іншых вучэльняў мастацтва. Нехта да нас прыходзіць сам. Мы ўсіх праглядваем, аднак бяром далёка не ўсіх. Але нават з тых, каго прымаем, прыжываецца адзін з дзесяці. Справа ў тым, што мы працуем на аснове класічнага танца, а для гэтага неабходна мець вельмі добрую фізічную форму.

Наш артыст абавязаны мець прывабную знешнасць, прыгожую паставу, музыкальнасць, артыстызм. Але найперш пры адборы мы глядзім на фізічныя даныя. Чаму? Таму што танцоўшчыку даводзіцца вытрымліваць дастаткова вялікія нагрузкі. Вы заўважылі, якія шырокія і высокія скачкі выконваюць нашы артысты? А гэта ж дасягаецца няпроста, штодзённымі і нялёгкімі трэніроўкамі, рэпетыцыямі да сёмага поту і мазалёў. Каб бездакорна танцаваць, павінна быць добрая, распрацаваная ступня, правільная пастаноўка спіны — інакш не будзе належнага кручэння. А ў нас круцяцца ўсе: і дзяўчаты, і хлопцы.

***— Як вядома, артысты — людзі складаныя, ранімыя, тонкія. Як вы з імі спраўляецеся?***

— Перш за ўсё — я іх люблю. Я за ўсіх іх перажываю, стараюся ўсім памагаць. І ў творчым сэнсе, і ў сацыяльным. І яны гэта адчуваюць, плацяць мне даверам і павагаю.

***— Цякучка кадраў ёсць?***

— Ёсць. І крыху большая, чым хацелася б. Прычыны? Тут і натуральная змена пакаленняў, і прафесійны рост — чалавека заўважаюць, давяраюць больш адказную, самастойную справу. Так было з Анатолем Кашталапавым. Ён узначаліў вядомы цяпер калектыў «Свята». І мы толькі рады, калі нехта ідзе на павышэнне, працягвае актыўна і плённа служыць мастацтву. На жаль, так бывае не заўсёды...

### І кожны дзень — пошук

***— Колькі бываю на канцэртах «Харошак», заўсёды захапляюся строямі вашых артыстаў — яркімі, нацыянальна-каларытнымі, непаўторнымі. Хто іх стварае?***

— Шыем у тых жа тэатральных майстэрнях, што і астатнія калектывы. Але шыем, вядома, па сваіх эскізах, сваіх распрацоўках. І стараемся кожны касцюм рабіць так, каб ён служыў шмат гадоў, таму што бюджэтныя сродкі на гэта абмежаваныя.

Калі я прыйшла ў нашу акадэмію навук і папрасіла паказаць мне ўсё, што ў іх ёсць па беларускім касцюме, навукоўцы паглядзелі на мяне, як на дзівачку, і развялі рукамі. Праўда, у той момант рыхтавалася невялікая кніга — яна ў мяне і цяпер ёсць, — але інфармацыі і там было небагата. Я падумала і вырашыла звярнуцца ў Ленінград. Яшчэ з часоў вучобы я ведала, што там, у тэатры оперы і балета, ёсць выдатныя майстэрні. На маю просьбу адгукнулася патомная мастачка гэтых майстэрань Галіна Смірнова. Разам з ёю мы шукалі матэрыялы ў запасніках Цэнтральнага этнаграфічнага музея. Шукалі і знайшлі. Такім чынам былі зроблены эскізы касцюмаў для першай праграмы.

Прынцыпова новым было тое, што мы свае касцюмы вырашылі ткаць. І сутыкнуліся з непрадбачанай праблемай. Аказалася, што нідзе ў рэспубліцы, ні ў адной майстэрні гэтым не займаюцца. Толькі ў Івянцы знайшлі нарэшце народную майстрыху Марыю Сасонку (дагэтуль памятаю яе прозвішча), якая ўзялася нас выручыць. Яна ўгаварыла яшчэ дзвюх жанчын, у якіх былі кросны, і ўсе разам зрабілі нам неабходную тканіну. Выдатныя атрымаліся касцюмы!

Цяпер касцюмамі займаюцца нашы мастакі Юрый Піскун і Аляксей Гаявы. Юрый абапіраецца на ўзоры традыцыйнага народнага мастацтва і ў сваіх работах падкрэслівае характар персанажаў, рэгіянальныя адметнасці нацыянальнага адзення. Аляксей больш схільны да паэтызацыі вобразаў, імкнецца надаваць касцюмам сучаснае гучанне, не губляючы нацыянальнага каларыту. А разам яны вырашаюць складаную задачу — зберагчы этнаграфічныя рысы той ці іншай мясцовасці і надаць метафарычнасць танцавальным персанажам.

***— Але ж вы стварылі для свайго ансамбля не толькі арыгінальныя касцюмы, а і адметны, самабытны аркестр...***

— Паколькі наш ансамбль фальклорны, то я палічыла, што і наш аркестр павінен складацца з народных інструментаў. Дарэчы, мяне даўно цікавілі і цымбалы, і ліра, і іншыя даўнія музычныя інструменты. Аднак калі я стала іх збіраць, многія мяне не зразумелі, казалі: навошта цягнуць гэтую старызну? Да таго ж ніхто не хацеў вучыцца на іх іграць. Даводзілася людзей угаворваць, пераконваць. У выніку нашы музыкі асвоілі яшчэ некалькі інструментаў у прыдачу да асноўнага. Клопату я з гэтым мела нямала, але ні пра што не шкадую. Старадаўнія інструменты надаюць нашаму аркестру асаблівы каларыт, выклікаюць цікавасць і захапленне ў нашых гледачоў. І я вельмі ўдзячная за вялікую дапамогу ў станаўленні аркестра Віктару Купрыяненку, Аляксандру Рашчынскаму.

А кіруе нашым аркестрам выдатны выканаўца і аранжыроўшчык Уладзімір Гінько. Ліра, жалейка, дудачка, басэтля, атанічныя цымбалы, гудок, інструменты з багуну, чароту, сцябліны пшаніцы — усё гэта ажывае, адгукаецца чароўнымі гукамі ў яго ўмелых, цудадзейных руках.

***— Вы прызналіся, што палюбілі Беларусь. А я дадаў бы: не толькі палюбілі, але і глыбока, вельмі тонка спасціглі народны характар, народную душу, бліскуча перадалі нацыянальны менталітэт сродкамі танца. Як вам, дачцэ паволжскіх стэпаў, гэта ўдалося?***

— А ў маіх генах, хутчэй за ўсё, ёсць і беларуская часцінка. Дзед і прадзед па мацчынай лініі былі, як яны казалі, родам недзе з-пад Чарнобыля, з палескай вёскі Гаявое. Дзеда звалі Алесь, і ў гаворцы яго пракідвалася шмат беларускіх слоў: шкло, вяроўка... Дый бабуля мая, калі часам я не слухалася, незадаволена бурчэла: «Гультаюга».

***— Адна з вашых апошніх відовішчных праграм — «Беларусы». Новая праграма «Харошак» адметная не толькі ўвасабленнем смелай фантазіі харэографа, але і сур'ёзнымі дасягненнямі ў інтэрпрэтацыі вядомых народных свят і абрадаў каляндарнага цыкла.***

— Зазначу, што за сорак гадоў сваёй дзейнасці мы стварылі больш за дзесяць буйных арыгінальных праграм, кожная з якіх увасобіла, увабрала ў сябе яркія, адметныя прыкметы розных часоў беларускай гісторыі. А цяпер я якраз працую над новай маштабнай праграмай, якая б аб'яднала ўсе гэтыя прыкметы ў адно цэльнае мастацкае палатно. І нават назва ўжо прыдумана — «Палёт над часам». Гэта сапраўды павінен быць такі своеасаблівы палёт, з вышыні якога гледачы змаглі б убачыць усю нашу шматвекавую гісторыю і культуру.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

## ■ Чытаем сваё!

# ПЕРШЫ ПАЛЕСКІ «ТОМ» «МАЛАДОСЦІ»




**Двухтомнік «Планета Палессе» — чарговы міжнародны праект часопіса «Маладосць». Куды, як не ў нетры самабытнага Палесся, мусім уцякаць мы, вязні ўрбаністычнай культуры, у пошуках уласных каранёў, аўтэнтычных традыцый, свежага паветра... І вось неўзабаве з'явіцца першы «том», прысвечаны Гомельскаму Палессю. Суправаджацца ён будзе адмысловым «Украінскім сшыткам» — мастацкімі творамі і іншымі культурна-літаратурнымі матэрыяламі, здабытымі пры дапамозе ўкраінскіх сяброў-палешукоў.**

Пачынаецца гомельская «Маладосць» артыкулам-падарожжам Святланы Дзянісавай «Брама ў Палессе», натхнёным нарысам Уладзіміра Караткевіча «Званы ў прадоннях азёр», які публікаваўся ў «Маладосці» 45 гадоў таму. Гэта яскравае апісанне вандроўкі аўтаркі па караткевічаўскім палескім маршруце.

Далей «Маладосць» накіроўваецца ў нацыянальны парк «Прыпяцкі — чароўны куточак, дзе можна шыкоўна адпачыць. У гэтым вас асабіста пераканае ягоны дырэктар Сцяпан Бамбіза.

Дзявятая «Маладосць» запрашае вас паспрабаваць расшыфраваць таямнічы код арнаментаў на палескіх ручніках. У гэтай няпростай справе дапаможа грунтоўны артыкул Аляксандра Драбушэўскага і Галіны Нячаевай «Старажытны геаметрычны чын знакаў у археалагічных і этнаграфічных помніках памежжа Гомельшчыны — Браншчыны — Чарнігаўшчыны».

«Выдатныя» гомельскага нумара — гэта паэт Сяргей Сапоненка, які пераехаў з Гомеля ў амерыканскі Сакрамента, а таксама маладая паэтка і прыдумшчыца Марыля Шлык — дзяўчына з Рагачова, якая стварыла цікавы сайт пра Мінск, дзякуючы якому на сталіцу змогуць па-новаму зірнуць як самі мінчукі, так і госці. У гэтым жа нумары змешчана падборка вершаў выдатнай Марылі.

Літаратурная частка змяшчае ў сабе аповесць вядомага пісьменніка і блогера Сяргея Балахонава «Без ста гадоў на разгадку» пра складанасці падлеткавага кахання, а таксама шчымлівыя вершы маладых паэтак Насты Кудасавай ды Дар'і Дарошкі.

«Український зошит», пра які мы ўжо ўзгадвалі, складаецца пераважна з паэтычных і празаічных твораў украінскіх аўтараў у перакладзе на беларускую, а таксама змяшчае інтэрв'ю з маладым украінскім пісьменнікам Максам Кідруком.

**Тамара САРАЧЫНСКАЯ**

## ■ Дарогі на «Куфар»

# «ЗАМАХНУЦЦА НА УІЛЬЯМА, НАШАГА ШЭКСПІРА»

**З 21 па 27 верасня ў сталіцы будзе праходзіць XI міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар. БДУ-2014». Удзел у ім возьмуць лепшыя студэнцкія калектывы і тэатральныя дзеячы з 15 краін. Фестываль пройдзе пад дэвізам «Усе дарогі вядуць на «Куфар».**

Сёлета фармат мерапрыемства набыў новую якасць. Так, у гонар 450-годдзя з дня нараджэння англійскага драматурга Уільяма Шэкспіра на сцэнічных пляцоўках Мінска будуць прадстаўлены пастаноўкі па яго п'есах. Па задуме арганізатараў — упраўлення па справах культуры БДУ — кожная сцэнічная дзея будзе расказана сучаснаму патрабавальнаму гледачу адаптаванай мовай. Таксама госці фестывалю ўбачаць сцэнічнае ўвасабленне праекта мінулага года «КуфарДрамаЛаб». На гэты раз арганізатары падрыхтавалі прэм'ерны спектакль «Гэта ўсё яна!» У фестывальную праграму «Тэатральнага куфра» вернецца аўтарскі праект «МонаК» — пастаноўкі малой формы. На гэты раз будуць прадстаўлены два монаспектаклі. Па традыцыі праграма «Куфар.by» прадэманструе лепшыя дасягненні беларускіх студэнцкіх тэатраў.

**Сяргей СТАРЫНАЎ**

# РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 20 октября 2014 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | Площади на 2 этаже, расположенные в капитальном строении (инв. № 130/С-35420) – отделение почтовой связи, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Центральная, д. 13а | 1 014 900 | 101 490 | 39,80 | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществлении производства (кроме вредных производств) |
| ЛОТ № 2 | Площади на 2 этаже, расположенные в капитальном строении (инв. № 130/С-35420) – отделение почтовой связи, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Центральная, д. 13а | 1 453 500 | 145 350 | 57,00 | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществлении производства (кроме вредных производств) |
| ЛОТ № 3 | Площади на 2 этаже, расположенные в капитальном строении (инв. № 130/С-35420) – отделение почтовой связи, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Центральная, д. 13а | 428 400 | 42 840 | 16,80 | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществлении производства (кроме вредных производств) |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды** |
| **Наименование арендодателя** | **РУП «Белпочта»** |
| **Срок договора аренды** | **не менее 3-х лет** |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в рег. дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369 УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 20 октября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

**1.** Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

**2.** Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

**3.** Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**4.** Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**5.** Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**6**. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

**7.** При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин.**

**Последний день приема заявлений – 17 октября 2014 г. до 17.00.**
**Контактный тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

# РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ТРАНСБУГ»

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | *Объекты недвижимости:*<br>Капитальное строение (инв. № 100/С-343), общ. пл. 718 м² – «Бытовой корпус», инв. № 0004; Капитальное строение (инв. № 100/С-344), общ. пл. 2462,7 м² – «Ремонтно-механическая мастерская», инв. № 0002; Капитальное строение (инв. № 100/С-345), общ. пл. 72,1 м² – контрольно-пропускной пункт, инв. № 0005; Капитальное строение (инв. № 100/С-347), общ. пл. 602,5 м² – «Механизированная мойка», инв. № 0009; Капитальное строение (инв. № 100/С-346), общ. пл. 1729,5 м² – Здание склада, инв. № 0006; Туалет кирпичный, инв. № 0059; Водопровод мех. мастерской, инв. 00073; Канализация фекальная мех. мастерской, инв. № 00072; Теплотрасса подземная, инв. № 00075; Сети водопроводные (гидрант), инв. № 70163; Телефонизация, инв. № 00050; Низковольтные сети наружного освещения, инв. № 00070; Дорога производственная автомобильная, общ. пл. 17344,08 м², инв. № 49; Ж/б ограждение, протяж. 291,834 м.п., инв. № 48; Емкость для хранения ГСМ, об. 22 м³, инв. № 69; Калитка, инв. № 70039; Ворота, инв. № 70040; инв. № 70041; Ограждение, пл. 14,85 м², инв. № 70042; Очистные отстойники, инв. № 99.<br>*Контейнерная АЗС:*<br>Контейнерная АЗС, инв. № 38, в составе: два контейнера, КАЗС, операторная АЗС; топливораздаточные колонки НАРА-22 КЭД-50-0,5-1 (2 шт.); резервуары наземные стальные, объемом 9,3 м³ (2 шт.)<br>*Имущество:*<br>Трансформатор 100 Квт, инв. № 413; вентилятор агрегатный Н359, инв. № 194; вентиляторы 4-70, инв. № 366; инв. № 367; кран-балка, инв. № 147; кран-балка 5,1 мм, инв. № 210; электроталь ПП-1, инв. № 250; кран опорный 3-т 10,5 м, инв. № 324; кран-балка, инв. № 397; кран-балка 3,2 т ТДЛ-10,8 м, инв. № 414; подъемники ПТО-16А, инв. № 266; подъемник ПТО-39, инв. № 372; подъемники ПК-8, инв. № 398; инв. № 399; инв. № 407; подъемник П-150, инв. № 408; подъемник П-161, инв. № 409; склад стеллажно-тарный автоматизированный СТАС-50, инв. № 579; инв. № 581; станок деревообрабатывающий, инв. № 95; станок точильно-шлифовальный 3Б-634, инв. № 47; вентиляторы радиальные Ц-4-70-12,5, инв. № 195; инв. № 196; инв. № 197; вентиляционная установка, инв. № 198; шлагбаум, инв. № 70043; система пожарной сигнализации, инв. № 70100; дистилятор Д3-4АО ЭМО, инв. № 70003; теплосчетчик ТЭН-05, инв. № 691; верстак ОРГ 5364, инв. № 314. | 9 028 235 700 | 451 411 785 |

| | |
|---|---|
| **Местонахождение объекта** | Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 114/2 |
| **Характеристики замельного участка** | Земельный участок площадью 2,3212 га с кадастровым номером 140100000001008553 |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Трансбуг» |
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369 УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 29 сентября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной стоимости объекта, вознаграждение Организатору аукционных торгов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 29 сентября 2014 г. до 10.00.**

**Контактный телефон организатора аукционных торгов: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 8 октября 2014 г. проводит повторный открытый аукцион № 18-А-14 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется **право аренды сроком на 99 лет 3 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов** в г.Минске:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | пер. Енисейский, 2-й, 62 | 500000000002008400 | 0,0429 | 200 080 650 | 30 000 000 | 9 759 295 |
| 2 | ул. Чекалина, 29 | 500000000002008396 | 0,0428 | 199 622 100 | 30 000 000 | 9 759 295 |
| 3 | пер. Малый Тростенец, 27А | 500000000002008398 | 0,1129 | 224 169 810 | 34 000 000 | 9 759 295 |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями.

**Аукцион состоится 8 октября 2014 г. в 16⁰⁰ по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после подписания договора аренды земельного участка;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить гражданину – не позднее одного года, юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю – не позднее 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного блокированного жилого дома.

**Для участия в аукционе необходимо.**

